
СВАЯ ЧАСОВА ЗДАЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ТЭКСТЫЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ВЫСОКАЯ КАСКУЮ СЫРАВІНУ
ПРЫМУСІМ КУЛАКА І ЗАМОЖНІКА ЗДЫКАНАЦЬ ЦЬ БЕРДАЕ ЗАДАНЬНЕ!
БАРАЦЬБА СА СТРАТАМІ ПРЫ ПЕРШАПАЧАТКОВАЙ АПРАЦОЎЦЫ ЛЬНУ - БАРАЦЬБА ЗА КОЛЬКАСЬЦЬ ЯКАСЬЦЬ ВАЛАКНА!
ЗЬНІШЧЭНЬНЕМ СТРАТ ПАЧАТКОВАЙ АПРАЦ ПАВЫСІМ АЦЭН ПАВЯЛІЧЫМ ДАХО
№ 33 (178)
РАБОТНІЦА КАЛГАСЬНІЦА БЕЛАРУСІ

Аб звальненьні за прагул бяз уважлівых прычын

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

З прычыны таго, што дзейнае працоўнае законадаўства (п. „е" арт. 47 кодэксу законаў аб працы РСФСР і адпаведныя пункты кодэксаў іншых саюзных рэспублік) дапускае звальненьне за прагул работніка бяз уважлівых прычын толькі ў тым выпадку, калі такі прагул меў месца на працягу трох дзён у агульнай складанасьці на працягу месяца, што ў цяперашніх умовах адсутнасьці бесправоўя заахвочвае прагулы, парушае нармальны ход вытворчасьці і наносіць страту інтарэсам працоўных, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляюць:

1. Пункт „е" арт. 47 кодэксу законаў аб працы РСФСР і адпаведныя пункты кодэксаў іншых саюзных рэспублік лічыць скасаванымі.

2. Устанавіць, што ў выпадку хоць-бы аднаго дня няяўкі на работу бяз уважлівых прычын работнік падлягае звальненьню з прадпрыемства або з установы з пазбаўленьнем яго права карыстаньня выданым яму, як работніку данага прадпрыемства або ўстановы, харчовых і прамтаварных картак, а таксама з пазбаўленьнем права карыстаньня кватэрай, прадастаўленай яму ў дамох данага прадпрыемства або ўстановы.

3. Прапанаваць урадам саюзных рэспублік унесьці адпаведныя зьмены ў кодэксы законаў аб працы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР М. КАЛІНІН.
Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР А. ЕНУКІДЗЭ.

15 лістапада 1932 году.
Масква, Крэмль.

НА ЖОРСТКУЮ БАРАЦЬБУ З ПРАГУЛЬШЧЫКАМІ

З энтузіязмам дэлегаткі абутковай сустрэлі пастанову

У гэты вечар настрой дэлегатак абутковай асабліва бадзёры. Яны зьбіраюцца ў сталоўцы на агульна-фабрычную канфэрэнцыю, каб абгаварыць важныя палітычныя пытаньні.

Канфэрэнцыя адбываецца за шклянкай гарбаты і зьяўляецца ўзорам нябывалай арганізаванасьці. Цішыня. Сур'ёзная ўвага да кожнага слова дакладчыка. Як відаць, гэтыя словы ўрэзваюцца ў памяць прысутных і пакідаюць глыбокае ўражаньне.

З захапленьнем і воплескамі сустракаюць дэлегаткі пастанову Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і СНК СССР „Аб звальненьні за прагулы бяз уважлівых прычын". Дэлегаткі першымі на фабрыцы абгаворваюць гэту пастанову. Словы дэлегатак — узор клясавай сьвядомасьці. Тут наглядна відаць, як вырасла палітычна наша работніца.

Дэлегаткі крытыкуюць адміністрацыю за мяккі падыход да прагульшчыкаў. За апошні час прагулы на фабрыцы павялічыліся. Прамфінплян за 10 месяцаў выканан толькі на 91 проц. Немалая доля невыкананьня—вынік злосных прагулаў.

Работніцы патрабуюць ад адміністрацыі жорсткіх мер да прагульшчыкаў. Ім ня месца на садыялістычнай фабрыцы. Прагульшчыкі павінны быць пазбаўлены права атрымліваць прадукты ў ЗРК.

Некаторыя работніцы прапанавалі, каб прагульшчыкі, якія зволены з фабрыкі, ня былі прыняты на іншыя прадпрыемствы. Дэлегаткі аднагалосна ўхвалілі пастанову ЦВК і СНК СССР, прызналі яе сваячасовай і прасілі адміністрацыю безадкладна яе выканаць у адносінах да прагульшчыкаў фабрыкі.

У адказ на пастанову ўраду дэлегаткі ўзялі на сябе рад абавязацельстваў, якія друкуюцца ніжэй.

Ня з меншай актыўнасьцю дэлегаткі абгаварылі даклад свайго ЗРК у сувязі з перавыбарамі праўленьня. Яны крытыкавалі асобныя недахопы ў рабоце магазыну і некаторых работнікаў прылаўку.

Дэлегаткі абяцалі ўсе як адна актыўна ўдзельнічаць у перавыбарах. Вылучана брыгада для абсьледваньня работы ЗРК. **Алена.**

Менск.

ПРАГУЛЫ ЗЬЯДАЮЦЬ НАШЫ РЭСУРСЫ

(Пастанова дэлегацкага сходу Менскай абутковай ф-кі імя Кагановіча)

Дэлегацкі сход работніц Менскай абутковай фабрыкі, заслухаўшы пастанову ЦВК і СНК СССР аб звальненьні за прагулы бяз уважлівых прычын, ухваляе гэту пастанову і лічыць яе зусім сваячасовай.

Прагулы зьядаюць нашы рэсурсы на тысячы рублёў тавараў шырспажыву, у якіх краіна адчувае востры недахват. Прагулы цягнуць за сабою прастоі фабрык, затрыманьне рук рабочых і невыкананьне прамфінпляну. Аб гэтым сьведчаць лічбы і на нашай фабрыцы. За 10 месяцаў гэтага году намі прамфінплян выканан толькі на 91 проц.

Мы, дэлегаткі-работніцы, абавязваемся: **павесьці рашучую барацьбу з прагульшчыкамі ў сваіх цэхах, групах, брыгадах, прымаючы актыўны ўдзел у фабрычным друку. Даб'емся сыстэматычнай работы з новымі работніцамі аб узмацненьні працдысцыпліны.**

Мы прапануем ЗРК зьнядь прагульшчыкаў з забесьпячэньня. Патрабуем ад адміністрацыі нашай фабрыкі і ўсіх фабрык ня прымаць на фабрыку прагульшчыкаў і зволіць злосных і непапраўных з работы.

Дэлегацкі сход работніц Менскай абутковай фабрыкі.

Б-ка Ср. Аз.

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА БЕЛАРУСІ

ЛІСТАПАД 1932 год — 8-мы год выданьня — № 33 (178)

ДА 1-га СЬНЕЖНЯ здаць дзяржаве НЯ МЕНШ 70 проц.

ДАБРАЯК СНАГА ІЛЬНА-ВАЛАКНА

Узмацніць тэмпы і якасьць апрацоўкі ільну

Посьпехі сацыялістычнага наступленьня дазволілі нам дабіцца буйнейшых вынікаў у барацьбе за ўраджай ільну. Лён вырван раней чым у мінулым годзе на пяць дзён.

Гэтых посьпехаў БССР дасягнула ў выніку правільнага, канкрэтнага кіраўніцтва ходам работы з боку партыйнай арганізацыі, рашучым націскам на кулака.

Зараз перад калгасамі, бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі стаіць ня менш важная задача— **першапачатковая апрацоўка ільну і здача добраякаснага ільнавалакна дзяржаве.** Гэты этап барацьбы патрабуе шырокай масавай работы, выразнага апэрацыйнага кіраўніцтва, правільнай расстаноўкі сіл.

Першапачатковая апрацоўка ільну мае вялізарнае значэньне. Ад яе залежыць колькасьць і якасьць выпрацоўваемай прадукцыі. Таму цэнтральнай задачай у часе апрацоўкі зьяўляецца **сваячасовае яе скончэньне, рашучая барацьба са стратамі.** А страты, якія мае дзяржава ў выніку няўменьня арганізаваць работу, няправільнай расстаноўкі сіл ў часе апрацоўкі, вялікія.

Раённыя арганізацыі ў пераважнай большасьці ня ўлічылі ўсёй важнасьці сваячасовай апрацоўкі ільну, барацьбы са стратамі, а ўсю работу па далейшай апрацоўцы ільну пусьцілі на самацёк. У выніку на 5 лістапада было яшчэ не абмалочана па БССР 3,7 проц. ільну, не разаслана— 5,1 проц. і ня ўзьнята 19 проц. Па паўночных раёнах на 5 лістапада не абмалочана 5,6 проц., не разаслана 6,8 проц. У Асьвейскім, Дрысенскім, Дубровенскім і Бешанковіцкім раёнах на сьцелішчах ляжыць непаднятага ільну каля 40 проц. А такія раёны, як Асьвейскі, Бешанковіцкі, Полацкі і Расонскі, не арганізавалі ручную апрацоўку ільну.

У гэтым годзе асноўная маса ільну, а іменна **80 проц. усяго ўраджаю павінна быць апрацавана ручным спосабам.** Гэта патрабуе добрай арганізацыі працы, правільнай расстаноўкі і скарыстаньня рабочай сілы.

Пераапрацоўка ільну ў асноўным павінна быць утворана ў гэтым годзе на мяльнаасушыльных і трапальных пунктах, якіх па БССР павінна быць прыстасавана і пабудавана 400. Але гэтай рабоце рад раёнаў не аддалі належнай увагі, палічылі, што займацца пабудовай мяльна-сушыльных пунктаў рэч непатрэбная. Напрыклад, Лепельскі раён зусім не прыступіў да арганізацыі пунктаў. І ўсяго па БССР арганізаваны 164 пункты.

Для бесьперабойнай работы гэтых пунктаў **неабходна ўзмацніць брыгады. Усіх вольных ад іншых работ неабходна перакінуць на апрацоўку ільну. Да кожнай брыгады давесьці плян выпрацоўкі і ўсю работу пунктаў перавесьці на 2—3-х вьменную работу. Шырока разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва.**

Брыгадзір павінен адказваць за сваячасовае выкананьне брыгадай работы, за якасьць работы, за апрацоўку ільну бяз страт.

Апэрацыйнае кіраўніцтва брыгадамі павінна быць пастаўлена на належную вышыню. Сярод калгасьніц і калгасьнікаў неабходна павесьці масава-растлумачальную работу, **сваячасова давесьці да калгасьнікаў ільготы, якія ўстаноўлены ўрадам для здатчыкаў ільну і для тых, хто апрацоўвае яго.**

Толькі пры ўмове выкананьня гэтых мерапрыемстваў можна дасягнуць посьпехаў у сваячасовай і добраякаснай пераапрацоўцы ільну.

Позьні расьсьціл, несваячасовы над'ём ільнатрасты, а таксама няўмелая сушка і трапаньне зьніжаюць нумарнасьць валакна.

Пры няўмелай рабоце на ільнамялцы страты валакна дасягаюць каля 15 проц. Асабліва вялікія страты бываюць пры несваячасовым над'ёме ільну са сьцелішчаў. Лён пры пералежваньні ў большасьці ідзе ў паклю і кудзелю.

Перад дэлегаткамі, калгасьніцамі, актывістамі баявая задача—рашуча змагацца са стратамі і тым павялічыць даходы калгасьнікаў.

Кулак, больш чым калі-небудзь імкнецца сарваць сваячасовую апрацоўку ільну, сабатуе сам і падбухторвае на гэта несьвядомых калгасьнікаў, пушчае ў ход усе сродкі, абы толькі пашкодзіць добраякаснай і сваячасовай апрацоўцы. Задача кожнай дэлегаткі, кожнай калгасьніцы—разьбіць кулацкія махінацыі.

Лістапад—рашаючы ў выкананьні пляну па здачы ільнавалакна дзяржаве. **Да першага сьнежня патрэбна здаць дзяржаве ня менш 70 проц. добраякаснага ільнавалакна.**

За сваячасовае выкананьне гэтых задач павінен змагацца кожны дэлегацкі сход, кожная дэлегатка, мабілізуючы на гэта ўсіх калгасьніц, бяднячак і сераднячак—адноасобніц.

ГПБ Ср.-Аз.

Дэлегацкія сходы на перадавыя пазыцыі барацьбы за лён

ЛЁН САМАЦЁКАМ НЯ ПОЙДЗЕ

Уборку ільну і канапель БССР у гэтым годзе скончыла раней чым летась на пяць дзён. Гэта дало поўную магчымасьць лепш падрыхтавацца да першапачатковай апрацоўкі ільну і сваячасова пачаць здачу (продаж) ільнавалакна дзяржаве. Але большасьць раёнаў абмежаваліся тым, што лён вырвалі, абабілі, а далейшую барацьбу за апрацоўку пусьцілі на самацёк. Партыйныя арганізацыі раду раёнаў ня сталі на чале барацьбы за лён, за добраякасную і сваячасовую апрацоўку яго і здачу. Зараз, калі мы знаходзімся ў самым адказным пэрыядзе барацьбы за лён—пэрыядзе апрацоўкі і здачы, патрэбна мабілізаваць усю ўвагу калгасьнікаў, калгасьніц, беднякоў і серадняко̆ў-аднаасобнікаў на лепшую апрацоўку ільну. **Барацьба за якасьць, за сваячасовае выкананьне пляну павінна стаць галоўнай задачай усіх калгасаў, калгасьніц, бядняцак і серадняцак-аднаасобніц.**

У пастанове СНК БССР ад 4-га кастрычніка ясна сказана, што **„тэмпы разгортваньня загатовак нездавальняючыя, асабліва па здачы тресты і саломы“**... і што **„ручная апрацоўка ільну па ўсіх раёнах амаль не пачата і ні адзін раён верасьнёўскага пляну ня выканаў“.**

Таму зараз перад раёнамі баявая задача—у кастрычніку выканаць верасьнёўскі плян і кастрычніцкі ў разьмеры **6 тысяч 536 тон (у пераводзе на валакно), ільнанасеньня—8 тысяч 315 тон, канаплянага насеньня—30 тон.** На выкананьне гэтай канкрэтнай задачы патрэбна мабілізаваць шырокія масы працоўных жанчын.

Большасьць раённых арганізацый не забясьпечылі ход загатовак апэрацыйным кіраўніцтвам, а ўсю работу пусьцілі на самацёк. У выніку гэтага агульны процант выкананьня пляну ільнавалакна па БССР на 10 лістапада выканан на 10,6 проц. Асабліва адстае Шклоўскі раён, які павінен здаць дзяржаве 16 тысяч 900 цэнт ільнавалакна. Дубровенскі раён плян загатовак ільнавалакна на 10 лістапада выканаў на 3 проц.



Ільнацерабілка за працай у калгасе (Маскоўск. вобл.).

Горш стаіць справа з калгасамі, якія абслугоўваюцца МТС, дзе на 15-Х плян быў выканан усяго толькі на 4,3 проц.

Партыйная арганізацыя Сіроцінщчыны ня здолела мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў на апрацоўку і сваячасовую здачу ільнапрадукцыі дзяржаве. Бязьдзейнасьць, самацёк прывялі да таго, што плян на 20 кастрычніка па ільнавалакне выканан на 0,9 проц., па ільнанасеньні — на 24,2 проц. Другая пяцідзеўка лістапада дала нязначны зрух у раёне. На 11 лістапада плян па здачы ільнавалакна выканан на 3,5 проц. Ня лепш справа і па Мсьціслаўскім раёне, у якім на 20 кастрычніка плян па здачы ільнавалакна выканан на 1,4 проц.

Ніякіх аб'ектыўных прычын, якія-б маглі апраўдаць такое ганебнае адставаньне, ня можа быць. **Недастатковае кіраўніцтва з боку партыйных і савецкіх арганізацый раду раёнаў, няўменьне мабілізаваць масы калгасьнікаў, беднякоў і серадняко̆ў-аднаасобнікаў на сваячасовае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай па здачы (продажу) ільну, недастатковы націск на кулака, няпоўнае скарыстаньне ільгот—вось прычыны адставаньня ў выкананьні пляну загатовак.**

Аднаасобны сэктар недапушчальна адстае. На 10 лістапада плян выканан толькі на 6,8 проц. Нізкі процант выкананьня гаворыць аб тым, што аднаасобны сэктар недаацэньваецца, што сярод беднякоў і серадняко̆ў-аднаасобнікаў не разгорнута масава-растлумачальная работа, што загатоўкі ільнавалакна не пастаўлены на належную вышыню.

Кулацка-заможныя гаспадаркі злосна ня выконваюць цьвёрдых заданьняў, усімі сіламі стараюцца затармазіць загатоўкі ільну, сабатуюць з апрацоўкай і сваячасовай яго здачай.

У Цьвёрдазаданьнікі Шумілінскага сельсавету, Сіроцінскага раёну, да першага лістапада здалі 0,12 тон замест 3,27 тон. Па Спаскім, Жаробіцкім і Старынаўскім сельсаветах, Сіроцінскага раёну, ад цьвёрдазаданьнікаў нічога не паступіла. Неабходна прымусіць кулацка-заможныя гаспадаркі сваячасова здаць дзяржаве ільнавалакно і добрай якасьці.

Чацьверты квартал зьяўляецца рашаючым у галіне выкананьня плянаў загатовак. У лістападзе і сьнежні патрэбна пераапрацаваць і здаць ня менш 75 проц. гадавога пляну.

Кожны дэлегацкі сход павінен дапамагчы партячэйкам у справе арганізацыі шырокіх мас працоўных жанчын вёскі на сваячасовае і добраякаснае выкананьне пляну загатовак. Неабходна шырока папулярызаваць **ільготы** для працуючых па ільне і здатчыкаў ільну. Кожная дэлегатка павінна сама паказаць прыклад ударнага выкананьня дырэктыў партыі. Дэлегаткі павінны быць застрэльшчыкамі **арганізацыі чырвоных жаночых абозаў ільну,** павесьці рашучую барацьбу з сабатажам кулака.

Да першага сьнежня ня менш 70 проц. добраякаснага ільнавалакна павінна быць здана дзяржаве.

В. Туравец.

Лён—дзяржаве

Нарыс Юркі Лявоннага

Было так:

— Увесну гэтага году, калі стала пад пагрозу ўсхожасьць насеньня ільну,—саўгас малады, належнымі складамі ня быў яшчэ забясьпечан. Заварушыўся мурашнікам рабочы калектыў Бігосава.

— Ратаваць насеньне!

Ратавацы!.. А коні заняты на сяўбе...

Ратавацы!.. А трактары гудуць на палёх...

І 17 тон каштоўнейшага насеньня рабочыя—па ініцыятыве жанчын-ударніц—дружна вынесьлі з гнілога памяшканьня на ўласных плечах. Бо яны ведалі: сацыялістычнай дзяржаве патрэбен лён—і плян бальшавіцкай сяўбы трэба выканаць.

Гэтай-жа вясной плян быў перавыканан: замест 600 *га* засеялі 602. Гаспадарчы разрахунак, які прынёс эканомію ў 33 проц. усяго працоўнага часу (1.565 гадзін замест 2.304), эканомію гаручага, змазкі,—узьняў прадукцыйнасьць самой працы і, памножаны на энтузіязм рабочых, даў бліскучыя вынікі.

Запытайцеся ў рабочых-„старычкоў“ (ёсьць такія ў саўгасе):

— Як працавалася калісьці ў абшарніка?

Яны раскажуць вам пра ўсю галечу жыцьця абяздоленых, пра ўвесь жах бесчалавечнае эксплёатацыі беднаты, пра цяжкія і цьмяныя будні работы на пана.

Яны раскажуць пра тое, як нэндза, руйнаваньне, жабрацтва перадкастрычніцкай вёскі прымусова гналі масы сялянства на пякельную, цяжкую работу. Іменна гналі.

Да 1930 году на гэтым месцы шумелі апантаныя вятры, і зямля прагна чакала сваіх заваявальнікаў. Кусты, цаліны, вазёрцы...

На тым баку Дзьвіны, за трычатыры кілёмэтры ад саўгасу, там, дзе пануе белы арол фашысцкай Польшчы, разьлегліся панскія маёнткі. Крышку на поўнач, у бок ад абшараў белапольскай магнатэры з саўгасам мяжуюць латыскія „засьценкі“—буйныя хутары капіталізаванай шляхты.

На гэтае месца прышлі бальшавікі, арганізавалі вакольную беднату, узброіліся тэхнікай, аграномаіяй, павялі заўзятае змаганьне за кожны адваяваны ад стыхіі гэктар.

XV гадавіну Кастрычніцкай рэ-

Хмялёва Ганна—ўдарніца к-су „Авангард“ (Лёьнянскі р.)

валюцыі (і трэцюю гадавіну свайго існаваньня) саўгас сустрэў не абыякімі дасягненьнямі: **добры трактарны парк, насеньняхавальнікі, прасторная сталоўка, двухпавярховы дом для рабочых...**

Сёлета вялізарнейшую ролю ў посьпехах і сяўбы і ўборкі адыгралі гаспадарча-разрахунковыя брыгады трактарыстаў. У саўгасе 16 трактараў. Але асаблівае ўражаньне пакідае жыльлёвае будаўніцтва. Учора, здаецца (і часткова сёньня яшчэ), нахохліваліся дробненькія халупкі старой вёскі—паглядалі бельмамі вакенцаў, уросшыя ў нявылазную гразь. Многа іх раскідана было ў беспарадку на тэрыторыі цяперашняга Бігосава... Зараз **уздымаюцца карпусамі новыя мураваныя дамы**—і халупкі распадаюцца, нібы картачныя палацы ад сьвежага ветру.

Учарайшы бядняк — **сёнешні рабочы саўгасу—жыве ў сьветлай чыстай кватэры.**

У жорсткай клясавай барацьбе рос і дужэў калектыў саўгасу Бігосава. Былі адкрытыя варожыя выступленьні — псаваньне трактараў, былі прагулы; скарыстоўваўся, нарэшце, амбон касьцёлаў у Росіцы... адсюль прабаваў кулак і яго агенты нашкодзіць саўгаснаму будаўніцтву. Дарма. Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі Бігосава ідзе наперад.

За адзін год партарганізацыя вырасла на 13 чалавек (было 7, стала 20 чал.). У дні Кастрычніка, зараз, у рады ленінскай партыі ўступілі рабочыя з вялікім рабочым стажам, лепшыя барацьбіты за лён т. т. **Пурмалец і Хаданкевіч.**

Уся работа саўгасу падпарадкавана аднэй мэце—бальшавіцкаму змаганьню за лён. Вось яны, лепшыя ўдарнікі сацыялістычных палёў, адданыя гэтай справе цалкам: **Цынгель Стася, Кажышкевіч Альфокс, Кучарэнка Аляксей...** Гэты сьпіс можна павялічыць, у прыватнасьці за кошт жанчын-работніц.

Гэта дзякуючы іх адносінам да працы, дзякуючы прыкладу гэтых ударнікаў пяцігодкі, за датэрміновае заканчэньне сяўбы, за датэрміновае сканчэньне цераблеьня, за рад інш. гаспадарчых перамог **саўгас атрымаў не адну прэмію.** Значную ролю ў перамаганьні часовых цяжкасьцяй на шляхох будаўніцтва адыграла насьценгазэта саўгасу.

Абавязацельствы па асеньняй сяўбе, узятыя саўгасам, у асноўным выкананы.

Вайсковая работа ў Бігосаве—на адпаведнай вышыні. Ёсьць ячэйка Асоавіяхіму, куды ўваходзіць пераважная колькасьць рабочых, цір і г. д. Пры гэтым жанчыны таксама не адстаюць у гэтай справе і даюць высокія якасныя паказальнікі.

Бігосаўцы ведаюць: там, за якіх 3-4 *км*, дзе напружана вока пагранічніка, дзе кусты маюць вушы і нельга пакладацца ў вайсковым сакрэце на самога блізкага прыяцеля,—нярухомы кардон. І чужы, прагны сьвет глядзіць позіркам сьцярвятніка з-за кардону.

Бігосаўцы—на варце!

Зусім ліквідуем прагулы

Рашуча ўдарыць па прагульшчыках

У гэтым нумары мы зьмяшчаем пастанову Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і СНК СССР аб прагульшчыках.

Гэта пастанова мае вялізарнае значэньне. У нашай краіне з посьпехам заканчваецца першая пяцігодка сацыялістычнага будаўніцтва. Праз месяц мы ўжо ўступаем у другую пяцігодку, пяцігодку пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Зразумела, што гэты гіганцкі рост, поўная ліквідацыя беспрацоўя патрабуюць ад усіх ўдзельнікаў сацыялістычнай будоўлі сталёвай пралетарскай дысцыпліны, каб найбольш поўна скарыстаць кожны рабочы дзень, кожную рабочую гадзіну. Гэта патрабуе рашучага зьнішчэньня ўсялякіх непарадкаў у выгворчасьці, **асабліва прагулаў, спазьненьняў на працу і лятунства.**

Прагулы прыносяць нашай сацыялістычнай краіне вялікую шкоду. Яны кожны год зьядаюць вялізарную колькасьць прадуктаў, неабходных працоўнаму насельніцтву. Сотні тысяч тон недаданага вугалю, мэталю, машын, мільёны мэтраў недавыпрацаванай тканіны, ня менш пар недавырабленага абутку і іншае—вынік прагулаў па няўважлівых прычынах.

За першае паўгодзьдзе 1932 г. на прадпрыемствах Наркамлёгпраму БССР прагулы склалі 5.742 чалавека-дні, або 1,14 проц. усяго рабочага часу. Ня лепш і на прадпрыемствах па цяжкай прамысловасьці. Зразумела, чаму многія прадпрыемствы ня выканалі прамфінпляну і недадалі дзяржаве прадукцыі шырокага ўжытку.

Цякучасьць рабочай сілы, лятунства і спазьненьні на работу—таксама вялікі ўдар па выкананьні прамфінпляну. Па прадпрыемствах Наркамлёгпраму БССР прынята 8.393 рабочых, а выбыла 12.358 (за першае паўгодзьдзе г. г.).

Прагулы цягнуць за сабою і прастоі машын. Гэтым зьмяншаецца заработная плата рабочых, бо за прастой выплачваецца 50 проц. Такім чынам, прагулы пагоршваюць матар'яльнае становішча рабочых.

Чым тлумачацца прагулы на нашых сацыялістычных прадпрыемствах? Гэта тлумачыцца тым, што побач з асноўнай часткай старых рабочых, добрых ударнікаў, адданых сацыялістычнай вытворчасьці, у нашу прамысловасьць за апошнія гады ўлілося многа новых рабочых. Гэтыя людзі раней не працавалі на капіталістычным прадпрыемстве, не перажывалі капіталістычнай эксплёатацыі. Гэта часта былыя дробныя ўласьнікі, якія яшчэ ня ведаюць сацыялістычнай прамысловасьці і таму ў іх няма сьвядомых сацыялістычных адносін да працы. Яны часта прыносяць з сабой на прадпрыемства дробна-буржуазныя настроі, рвацкія імкненьні, „жаданьні даць савецкай дзяржаве работы паменш і пагорш і садраць з яе грошай пабольш“ (Ленін). Таму мы маем выпадкі парушэньня працоўнай дысцыпліны—прагулы, спазьненьні на работу, лятунства.

Гэта абавязвае прафсаюзныя арганізацыі ўзмацніць выхаваўчую работу сярод новых пластоў рабочых і работніц, укараніць у іх сацыялістычныя адносіны да працы.

Але побач з масава-растлумачальнай работай трэба прыняць да злосных прагульшчыкаў жорсткія адміністрацыйныя меры ўзьдзеяньня. Таму апошняя пастанова ЦВК і СНК СССР зьяўляецца зусім сваячасовай і канчаткова паложыць канец злосным прагулам.

Трэба адзначыць, што за апошні час мы маем значную цякучасьць жаночай рабочай сілы на многіх прадпрыемствах БССР. На Віцебскай швэйнай фабрыцы „Сьцяг індустрыялізацыі“ за 8 месяцаў кінула работу 3.200 работніц. Шырока разгорнутай масавай работай сярод работніц, рашучай барацьбой з злоснымі прагульшчыцамі паложым канец гэтым агідным зьявішчам.

Паводле пастановы ЦВК і СНК, ЗРК павінны перабудаваць сваю работу з тым, каб лепш забясьпечваць сапраўдных рабочых-ударнікаў. Прагульшчыкі зусім зьнімаюцца з забесьпячэньня.

Зараз работа ЗРК будзе падпарадкавана кантролю адміністрацыі прадпрыемства. Намесьнік дырэктара па забесьпячэньні непасрэдна будзе кіраваць разьмеркаваньнем фондаў па забесьпячэньні рабочых. Перабудова работы ЗРК дасьць магчымасьць зьнішчыць цякучасьць рабочай сілы.

Два харкаўскія заводы „ХЭМЗ“ і „Серп і молат“ зрабілі пачатак. Яны ўжо зьмянілі ў сябе сыстэму выдачы прадуктовых картак. Хлебныя карткі сапраўдны толькі тады, калі на іх ёсьць подпіс табельшчыка аб тым, што рабочы гэту пяціднёўку працаваў у цэху. Гэта ў кастрычніку дапамагло зьменшыць цякучасьць рабочай сілы да 1,6 проц. з 4,1 проц. у верасьні. Вопыт перадавых харкаўскіх прадпрыемстваў трэба перанесьці і на прадпрыемствы БССР.

Дэлегацкія сходы работніц павінны разгарнуць вялікую растлумачальную работу вакол новага закону аб барацьбе з прагуламі. Трэба практычна дабіцца ў сувязі з гэтым ліквідацыі цякучасьці рабочай сілы і спазьненьняў на работу. Гэты закон зьяўляецца магутным сродкам выхаваньня работніц, узмацненьня працоўнай дысцыпліны, пашырэньня здаровых сацыялістычных адносін да работы.

Е. Э.



Магазын і рабочыя кватэры на Днепрабудзе.

На ўскрайку Лёзны

Мароз падсушыў непраходныя гразкія вуліцы. Выпаў першы сьнежок.

Па аднаму, паркамі вазоў і па некалькі адразу падвозяць трасту да заводу. Новая партыя сыравіны, толькі што прынятай вагаўшчыком, ідзе далей у складаныя вандраваньні па заводзе. Падсартаваная, падсушаная ў заводзкай сушні, яна ідзе далей у пераапрацоўку.

Гул у мяльна-турбінным аддзяленьні. Прывычнымі рухамі работніцы раскладваюць трасту на сталох і па канвэеры адпраўляюць у пражорлівую гарлянку мялкі. Прамятая і напалову страціўшая сваё першапачатковае аблічча, траста падхапляецца швінг-турбінай і тут трэплецца. Ужо адгэтуль выходзіць валакно чыстае, ні аднэй кастрынкі. Потым сартаваньне, упакоўка і раскладзены па сартох лён ідзе далей, дзе яго чакае новае вандраваньне ўжо на фабрыцы.

* * *

Лёзьнянскі ільназавод са сваімі пабудовамі раскінуўся на ўскрайку мястэчка. Гэта адзіная пакуль што вытворчасьць у Лёзьне.

Завод меў заданьне: за кастрычнік пераапрацаваць 152 тоны трасты, фактычна-ж пераапрацавана 98,5 тоны, што складае 64,8 проц. пляну. Кудзелі патрэбна было пераапрацаваць 43 тоны, пераапрацавана — 39. Трэба было выпрацаваць доўгага валакна 80 *цнт*, а выпрацавана толькі 33,5, або 42 проц. Тое-ж самае і ў першай декадзе лістапада. Паводле пляну трэба выпрацаваць 24 *цнт* доўгага валакна, выпрацавана 12 *цнт*. Кароткага валакна трэба выпрацаваць 62 *цнт*, выпрацавана 44. Як бачым з прыведзеных лічбаў, ільназавод мае сыстэматычны прарыў, бо плян ня выконваецца.

У чым-жа прычына адставаньня ільназаводу? Прычына адна— не ажыцьцяўляюцца на заводзе шэсьць умоў тав. Сталіна. Ёсьць вялікая цякучасьць рабочай сілы, якая дасягае такіх разьмераў, расказвае тэхнарук тав. **Оліфсон**, што за апошнія два месяцы пасьля рамонту заводу ўшло каля $^1/_3$ усіх рабочых. У бухгальтэрыі такога ўліку няма, бо рабочыя прыходзяць на завод, працуюць два-тры дні і кідаюць яго. А таму зараз адчуваецца востры недахват рабочых, трэцяя зьмена зусім не працуе.

На заводзе зусім адсутнічае масавая работа з работніцамі, няма барацьбы з прагуламі і цякучасьцю.

Дрэнна матар'яльнае абслугоўваньне рабочых. Невядома з якой прычыны райспажыўтаварыства адмовілася ад забесьпячэньня заводзкай сталоўкі, а таму ў сталоўцы цэны рыначныя. Самазагатоўкі разгорнуты дрэнна, або, правільней будзе, калі скажам, што зусім адсутнічаюць. Пры сталоўцы няма адкормачных пунктаў, не гадуюцца трусы, куры, а чакаюць манны з неба. Абеды, сьнеданьне і вячэра дрэннай якасьці.

Сталоўка знаходзіцца ў халодным памяшканьні клюбу, дзе вокны выбіты, а ў кутках па калені бруду.

Ёсьць інтэрнат на 20 асоб жанчын, які зараз рамантуецца. Але цікава, чаму гэта адміністрацыя пачала яго рамантаваць тады, калі выпаў сьнег і сталі марозы? Апрача гэтага ў інтэрнаце вільготна, брудна, наглядаюцца выпадкі пакраж.

— Чаму гэта закрыт ваш ларок?—пытаемся мы. — Бо няма чаго прадаваць. І сапраўды, ларок зачынен амаль заўсёды, бо ні плянавага, ні праз самазагатоўкі забесьпячэньня рабочых няма. Таксама „забясьпечваецца" і тэхпэрсанал.

Каля паловы рабочых заводу складаюць жанчыны, сярод іх ніякай масавай работы не вядзецца.

Дэлегацкі сход выбіраўся ў мінулым годзе і, знаходзячыся пад носам райкому КП(б)Б, не працуе. Ніхто нават і ня думае наладзіць яго працу. Дзякуючы адсутнасьці масава - выхаваўчай працы ў інтэрнаце ёсьць непаладкі паміж работніцамі украінкамі і беларускамі.

На заяву работніцы аб гэтых непаладках тэхкіраўніку т. Оліфсону, ён абяцаў аддзяліць у інтэрнаце украінак і беларусак. —Мы вам дадзім комнатку, і вы там будзеце жыць утрох, сказаў ён работніцы украінцы.

Вось як разумее Оліфсон інтэрнацыянальнае выхаваньне.

Парт'ячэйцы трэба абавязкова зьвярнуць увагу, на ўзмацненьне інтэрнацыянальнага выхаваньня ў інтэрнаце сярод работніц заводу.

Кіруючыя арганізацыі заводу не змагаюцца за ліквідацыю недахопаў. Замест рашучых захадаў да ліквідацыі цякучасьці, паляпшэньня культурна-бытавых умоў рабочых, умацаваньня культурна-масавай работы бяз усякіх на гэта дазволаў адміністрацыя разам з заўкомам увялі дзесяцігадзінны рабочы дзень. Гэта зьяўляецца злостным парушэньнем кодэкса законаў аб працы. За такія дзеяньні неабходна прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Пару слоў аб загатоўцы сыравіны. Траста паступае на завод самацёкам. У гэтай галіне завод цалкам пакладаецца на Загатлён. І таму некаторы час траста зусім не паступала, а за апошнія дні паступае „у гадзіну па чайнай ложцы". Завод мае і дагавор з канторай Загатільну, якая павінна даць яму 4.240 тон трасты, прычым ня менш 65 проц. высокаякаснай № 1,75 і вышэй. Але завод думаў і думае, што ў загатоўках яго хата з краю, адсюль гадавы плян выканан толькі на 30 проц. Заданьне на лістапад загатаваць 1.850 тон, а загатавана 126 тон, прычым 70 проц. трасты нізкаякаснай нумарной і паўтаранумарной. Дзеля таго, што калгасы ня добра праінструктаваны, які лён трэба здаваць на завод, часта яго адпраўляюць дасушваць або складваюць ля заводу, дзе ён мокне пад дажджом і сьнегам, як гэта можна назіраць і зараз. Таму сярэдняя нумарнасьць выходзячай прадукцыі—12.

Сацыялістычныя мэтады працы кепска папулярызаваны на заводзе. Ёсьць паасобныя ўдарнікі, якія па-бальшавіцку адносяцца да працы, напрыклад, **Віткоўская Ганна, Формунова Мар'я, Новікава Алена, Новікава Лісавета**, але іх вопыт не выкарыстоўваецца і не пераносіцца ў іншыя брыгады.

Далей такога становішча быць ня можа.

Раённыя арганізацыі і партячэйка павінны заняцца становішчам ільназаводу імя Молатава.

Лёзна.

С.

ГПБ Ср.-Ад.

„БАБСКІ КАЛГАС“

Ужо ў цягніку спадарожнікі з гэтай мясцовасьці даюць „характарыстыку калгасу:

— „Новае жыцьцё“ — калгас невялічкі, але моцны... Дружны калгас. Адно цікава: скрозь жанчыны. Жанчына старшыня праўленьня, жанчына сакратар. Цікавы калгас...

У нізкай бярвенчатай хаце, пры няроўным сьвятле газавае лямпкі старшыня—Алена Шчэрба — апавядае пра гісторыю ўзьнікненьня, паступовы рост і сучасныя будні „Новага жыцьця“. Гэта—не маладая ўжо жанчына, сьляды жыцьцёвых дарог запалі сотнямі зморшчын на стомленым твары, але, калі яна пачынае казаць пра ўпартую барацьбу за кожнае цялё, за кожнае каліва калгаснага збожжа, гады застаюцца ззаду і ў цёмных вачох закіпае маладосьць...

— Цяпер у калгасе ў нас 20 сем‘яў і адна адзіночка. А зямлі—215 гэктараў. Арганізаваўся калгас увесну 1929 году, але дзе тады не арганізоўваліся калгасы. Ну, адразу была ўся вёска і пайшла... Ды як толькі загібы скончыліся, амаль усе і павыходзілі.

Толькі я, праўда, як увайшла ў калектыў, то ўжо ня вылазіла. Яшчэ са мною двое: Юрэвіч ды Ярашэвіч Рыгор...

Бывала, я сьцерагу „стада“ наша, як гэта цяпер кажуць „буйнай рагатай жывёлы“, а яны—кормяць... Ох, цяжка было спачатку... Набраліся гора.

А з часам бяднячкі ды сераднячкі нашы ўсьведамляць сталі, што ў калгасе—выйсьце... Зноў запісвацца пачалі.

Цяпер—у нас калектыў ня дрэнны. Працуем дружна, узгоднена, весела. **Птушніцкая фэрма ў нас—196 старых курэй і звыш шаўтары тысячы куранят. Каля 30 коняй маем, 15 дойных кароў, 16 сьвіней вялікіх ды 5 падсьвінкаў,** авечкі ёсьць. Штогод—з прыростам. А пачалі ў 1930 годзе з 7 кароў... Гэта вам ня жартачкі.

З веснавой сяўбой сёлета ўправіліся добра, датэрмінова выканалі свае пляны. А таму і з уборкай не падкачалі. За пяць дзён зжалі, у копы паставілі і зьвезьлі. І з сенакосам не зацягнулі, хоць запражных коняй на той час усяго 16 і было... Ня дрэнна скасілі, няма чаго казаць.

... Старшыня—Алена Шчэрба—варта таго, каб пра яе сказаць асобна. Яна з дванаццаці гадоў у гэтай ваколіцы—за батрачку ў кулакоў. Сірата, малапісьменная, яна сапраўды прыняла ня мала пакуты, ня мала зьдзекаў і кпін на сваю долю...

Жыцьцёвая школа надзейна выхавала яе—і не дарма Аленай Шчэрбай трымаецца калгас, не дарма яна такі папулярны чалавек у раёне.

А трэба адзначыць, што сельсавет, дый райкалгассаюз, зусім слаба дапамагаюць гэтай адзінай у раёне жанчыне — старшыні праўленьня калгасу. Гэтым карыстаюцца клясавыя ворагі і па свайму дзейнічаюць у мэтах яе кампрамэтацыі.

Падкулачнікі Абрамовічы, Марозавы абвінавацілі, напрыклад, надоечы Алену ў тым, што нібы яна прыкішэньвала сабе калгасныя грыўні. 4—5 дзён узапар вазіла яна на рынак малако для продажу, па 1 руб. 20 кап. за літар. „Шчырыя калгасьнікі“, „ахоўцы грамадзкай маемасьці“ з памянёных сем‘яў (у каго, між іншым, браценік раскулачаны, у каго бацька ў Салаўкох...) распусьцілі чуткі:

— Яна на рынку прадае малако па 1 руб. 30 кап. літар, а грыўню сабе бярэ. Ведаем гэтую Шчэрбіху, яна і не на такую справу здольна. „Старшыня“...

Праверка становішча разьбіла ўшчэнт хлусьню агентуры разьюшанага кулака...

У самым калгасе яшчэ жывы нездаровыя настроі вузка-ўласьніцкага парадку. Чаго варты, скажам, намаганьні самога палявода, Пракопа Абрамовіча.

— Не дасі луг скасіць па каровах—зімаваць някошаны будзе. Гэта той самы Абрамовіч, што ў разгар палявых работ спакойна апраўляе ўласную калоду пчол...

Такім чынам, два-тры чалавекі значна перашкаджаюць нармальнай, пасьпяховай рабоце калгасу, імкнучыся падарваць яго з сярэдзіны. Паўстае з усёй няўхільнасьцю задача адсеву, ачышчэньня калектыву ад чужых, кляса-ва-варожых элемэнтаў.

У вогуле-ж **арганізацыя працы ў калгасе „Новае жыцьцё“—прадуманая, уважлівая і здаровая.** Цікава, як убіралі сёлета лён. Засеў ільну ў 10 гэктараў быў разьбіт на паасобныя вучасткі, па чвэрці *га* ў кожным. Вучасткі даручылі пэўным калгасьнікам—такім шляхам **дамагаліся ліквідацыі абязьлічкі. Шырока разьвіваючы мэтады сацыялістычнай працы—ударніцтва, сацспаборніцтва—сваічасова, з высокімі якаснымі паказальнікамі ўбралі лён.**

— Вось яшчэ што ня ладна ў нас,—скардзіцца Алена,—гэта з улікам... Няма добрага рахункавода—і гэта надта адчуваецца... Станкевіч Броня—яна ў калгасе і за сакратара, і за бухгальтара—ня можа справіцца, як належыць... Дый маладая яшчэ, не асьвечаная... Куды ёй.

Па заклапочаным твары Алены Шчэрбы прабягае цень. Мімаволі зьдзіўляешся энэргіі і адданасьці гэтай жанчыны, радуешся разам з ёю і сумуеш яе сумотамі. Як яна хварэе за свой калгас,

За печкай настойліва і аднастайна пяе цвыркун. Шамацяць прусакі ў кутох. На палатках уздыхае і варочаецца муж Алены—вэтэран руска - японскай вайны...

У былую нэндзу і гвалт ідзе сьвятло новага быту, новых людзкіх узаемаадносін; на закопчанай столі рэзка вызначаецца провад электрычнасьці з мядзяным патронам, пярэдні вугал заняты не абразамі цьмяных спасаў і багаматак, а партрэтамі правадыроў, лёзунгамі і плякатамі, з боку, на стале, ляжыць кіпка параўнальна сьвежых газэт...

* * *

Да XV гадавіны Кастрычніка ў калгасе „Новае жыцьцё“ абсталёван новы куратнік на 1.000 птушак, а таксама з балотных нетраў Аршаншчыны, з сэрца электрыфікацыі Савецкай Беларусі,—І-ай БелДРЭС—пабег па слупох у калгасныя хаты магутны электраток.

„Бабскі калгас“ ідзе наперад.

Юр. Лявонны.

Чырвоныя абозы ільну адзін за другім

Няма Буёў—ёсьць калгас імя Варашылава. Нават старыя толькі ў сваіх успамінах гавораць аб Буёх. А зараз гавораць аб варашылаўцах. За два гады калгас перавярнуў усё жыцьцё старых Буёў. Сьледу не засталося ад былой хутарской замкнутасьці. З 80 гаспадарак, якія ўваходзяць у калгас, 7 гаспадароў жывуць разам, рэшта раскінуты па хутарох у рады ўсе 3—5 кілёмэтраў. Гэту адлегласьць праглынула калектыўная праца сталых калгасных брыгад. Сацспаборніцтва зьвязала і згуртавала іх у моцны бадзёры калектыў.

У мяльным пункце брыгады № 2 красуецца на сьцене чарговы нумар брыгаднай газэты. Крывыя літары распаўзьліся па паперы і дразьняць адстаючых. Вельмі вялікімі літарамі напісан выклік першай групы, кінуты другой групе. Асноўнае ў выкліку—якасьць апрацоўкі і апрача якасьці тэмпы. Скрыпяць драўляныя мялкі. Хутчэй ходзяць рукі тых, хто круціць іх, бо брыгадная насьценка не дае забыцца.

Не адстаюць і тыя, якія незадоволены былі, што ў выкліку ўстаўлены выходныя дні і асабліва на выходныя дні напіраў выклік, клікаў працаваць бесьперапынна.

І працуюць... **Бесьперапынна працуюць мяльныя пункты.**

Працоўны дзень на ўсіх шасьці мяльных пунктах калгасу імя Варашылава пачынаецца ў 2 гадзіны ночы. Усяго па мяцьці і трапаньні занята 16 мужчын і 40 жанчын. Кожны дзень калгас дае апрацаванага ільнавалакна 5—6 цэнтнэраў.

Ужо тры чырвоныя абозы адправілі варашылаўцы ў Лёзна, што дало дзяржаве 24 цнт валакна і 33 тоны трасты (лічбы на 16-XI). **На 18 лістапада калгас рыхтуе чырвоны абоз у гонар куставога зьлёту калгасьнікаў і аднаасобнікаў.**

Першая брыгада ільну мела 16 *га*. Увесь лён брыгада ўжо здала (прадала дзяржаве). Яна сваіх герояў па ільне ўжо занесла на чырвоную дошку. **Сіманенка Феня і Каралёва Ганна** лепшыя з іх. Кожная брыгада мае сваіх Сіманёнак і Каралёвых.

Яны ўжо атрымалі прамтавараў больш як на тысячу рублёў за сваю ўдарную працу. Прыкладам можа служыць брыгадзір першай брыгады, які ў гэтым годзе атрымаў гарнітур, фрэнч і дзьве пары штаноў.

Калгасьнікі і калгасьніцы калгасу імя Варашылава ўпэўнены, што свае абавязкі перад дзяржавай па здачы (продажу) дзяржаве ільну яны выканаюць у тэрмін.

В. К.

Лёзна.

ПРЭМІЯВАЦЬ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ

ЗМАГАЮЦЦА ЗА ЯКАСЬЦЬ ІЛЬНАВАЛАКНА

Калі вы пытаецеся, дзе праўленьне калгасу „Праўда", то вам паказваюць на шкляную вэранду і жоўтую афарбоўку дому. Навокал відаць гаспадарчы парадак. Недалёка будуецца новая стайня на 30 коняй. Абора ўжо закончана, дзе стаяць добрыя сытыя палепшанай беларускай пароды 40 дойных кароў. Цяляты і 3 бугаі стаяць у асобных хлявох.

Калгас мае жывёлагадоўчаільняны ўхіл. Ільном ганарацца калгасьнікі. Больш 60 *га* засеялі. Добра дагледзелі і сваячасова ўбралі яго з поля. Сьпяшаліся калгасьніцы. Бо пасьля вытворчай брыгаднай нарады, дзе разьбіралі пытаньне норм выпрацоўкі па ільне і павышэньня яго якасьці, калгасьнікі і калгасьніцы добра ўцямілі, што ад сваячасовай уборкі залежыць якасьць ільну. Нормы па рваньню ільну калгасьніцы перавыконвалі. **Лікса Ганна вырывала 480 жмень** замест нормы ў 300, **Міхалеўская—450, Рамашкова Мар'я—446**. Ёсьць і рад іншых жанчын, якія нормы перавыконвалі.

Пасьля ўборкі калгасьніцы самі прызналі, што лепш вызначаць нормы ад плошчы, а не па жменях. Пры нормах па жменях выходзіць многа недарэчнасьцяй і сваркі. Жмені робяць няроўныя і брыгадзір ня можа праверыць кожны дзень. А акрамя гэтага былі такія жанчыны, якія пры цераблень перабягалі з месца на месца, шукаючы больш густога ільну. Калгасьніцы мяркуюць на будучы год увесьці нормы ад плошчы.

На 17-XI калгас выканаў 83 проц. пляну па здачы ільну.

Калгасьнікі змагаюцца за лепшую якасьць ільну. Праўленьнем вылучаны спэцыяльныя людзі для сартаваньня апрацаванага ільну. Калгас цьвёрда паставіў сабе мэтай дабіцца стандарту ільнавалакна № 14.

Калгасьнікі ўжо атрымалі за лён на дзьве тысячы руб. прамтавараў. Ударнікам выдзелілі больш дэфіцытныя тавары. Аднак прэміяваньня ўдарніц па ільне ня было. **Кандратава.**

Лёзна.



Лёзьнянскі ільназавод.

Мялкі гулі бесь

Ударніца Бондарава Хадора вытропвае 33 *кг* валакна, калгас „Авангард".

Яшчэ скрыпелі студзеньскія марозы, яшчэ расла пухова-сьнежная коўдра зямлі, а падрыхтоўка да вясны ўжо кіпела. Ссыпалі насеньне, правяралі ці добры зародак, які будзе з яго парастак. Гудзелі „трыумфы", „трыеры", шчабяталі трашчоткі, аддзяляючы пустазельле ад насеньня.

Лён у калгасе „Авангард"—галоўнае, а таму, каб хапіла на ўсе 50 плянавых гэктараў, засыпалі даволі добрагатунковага даўгунцу з разьліку 1,2 *цнт* на гэктар, ды апрача таго 15 проц. страхавога фонду на ўсялякі ліхі выпадак.

Стары дзядуля Пётра Падпаяскін дні і доўгія зімовыя вечары абглядаў збрую. Ладзіў хамуты, падсядзёлкі, рамантаваў гужы. Грукаталі маладыя калгасныя кавалі ў кузьні, прыводзілі ў парадак плугі, калёсы, бароны, складаныя машыны.

Коні адгулялі за зіму, набылі сілы, бо даглядаліся добра і былі гатовы да працы.

Плянавасьць палепшыла падрыхтоўку. Склалі дзьве сталыя вытворчыя брыгады, абгаварылі заданьне, давялі яго да кожнага калгасьніка і калгасьніцы. У адну ўвайшлі 15 мужчын, 18 жанчын і адзін падростак, у другую—12 мужчын, 14 жанчын і два падросткі. У іх поўнае распараджэньне аддалі зямлю, інвэнтар, коні, насеньне.

Упарта і штодзенна рыхтаваліся да пробнага выезду і ўжо ў канцы сакавіка калгас выехаў (пробна) у поле. Вострыя лемяхі лёгенька трывожылі зярністы сьнег, вытрыманыя коні з нецярпліваcьцю парываліся ўперад. Камісія з парт'ячэйкі сельсавету і ад саміх калгасьнікаў правярала спраўнасьць інвэнтару, дакладнасьць арганізацыі працы, расстаноўку сіл. Шукалі недахопаў, але дармо, усе зьвеньні гатовы хоць сёньня ў бой.

Сонца забіралася штодзень усё вышэй і вышэй. Млеў сьнег, павольна садзіўся і гінуў. Зьявіліся першыя прагалінкі. Неўзабаве глеба падсохла і калгасьнікі дружна выехалі ў поле. Нормы ворыва перавыконваліся, працавалі ўпарта.

Лён быў засеян да першага чэрвеня. Цёплае надвор'е і дожджыкі хутка пагналі ўверх маладыя адросткі калматага ільну. Трава з ільном жывуць ня ў дружбе—гэта ведаюць калгасьнікі, таму ў росьце 10—15 сант. яго палолі, а праз два тыдні палолі яшчэ раз. Дружна рос лён, чысты ад пустазельля. А калі зацьвіў, радавалася сэрца калгасьнікаў папярэднім вынікам сваёй працы. Уперадзе адказная пара—уборка і галоўнае ўборка свая-часовая.

Ня даць ільну перастаяцца на корані, убраць яго ў пэрыяд раньняй жоўтай сьпеласьці—важнейшая ўмова ўздыму ўраджайнасьці. Гэта добра зразумелі калгасьнікі, а таму якраз у пору, другога жніўня, калгасьніцы вышлі рваць лён. Разгарнулася сацспаборніцтва групавое і індывідуальнае. Калгасьніцы выклікалі адна другую, імкнучыся паскорыць раньне, хутчэй скончыць уборку. Для лепшага ўліку працы калгасьніцы разьбіліся на маленькія групы па 3-5 чалавек, якія працавалі поруч на адведзенай ім плошчы.

Норма выпрацоўкі па рваньні ільну была прынята—0,10 *га* на працадзень. Паасобныя ўдарніцы гэту норму перавыконвалі. **Бондарава** Матрона вырывала ў дзень 0,165 *га*, **Падпаяскіна** Домна — 0,155 *га*, **Бондарава** Хвядора, **Бондарава** Ганна, Дуня і іншыя—па столькі-ж.

Не адставалі калгасьніцы і з першай брыгады. **Казлова** Тацьцяна, **Конікава** Кацярына, **Бабкова** Ганна выпрацоўвалі па 0,145 *га*.

Сацыялістычным адносінам да працы і ўмацаваньню працоўнай дысцыпліны спрыяла рэгулярнае і акуратнае запісваньне працадзён. А калі часамі брыгадзір выпадкова адцягваў з запісам працадзён, калгасьніцы настойліва патрабавалі.

— Зараз-жа запішаць, каб перад сном я ведала, што за дзень зрабіла—заяўлялі калгасьніцы, і працадні зараз-жа запісваліся.

— Ну і тэмпы-ж у вас—дзівяцца суседнія калгасьнікі. Здаецца-ж і мы ня гуляем. Гэта-ж трэба ільну з паўсотні *га* абмалаціць за чатыры дні.

А што-ж, — адказаў Герасім Казлоў,—вось я пры норме ў чатыры капы абмалочваю 12 коп. **Бондарава** Хвя-

дора, К
вось таб
хто не в

Разам
цой, калі
абабіты
зяць на
зноў мал

Тры т
падымалі

Самае
яшчэ наг
Кузьма ў
тры мялк
кладвалі

І калі
ведзена
8 мяльна-
у дзень
усё было

Падліч
На кожны
сушыльш
Закіпела

12 гадз
шуе на
агеньчык
жух. А
Зараз тол

Загулі
рапынна
равы вы
другая, т
пова пера

Здаров
шчыц сь
да працы
выбіваюч
валакно з

У апра
гарду" па
ды больш
Бабкова
норме ў
тропвае
баева Ма
вае 38 *к*
сюкова М
вае 24 *к*
Хвядора-
лёва Ган
тычна
35 *кгр.*

Гэтыя
вынік шт
рокай ра
працы
камсамол
па папул
станоў
апрацоўц
как ільну



Ударніца Бондарава Хоўра абтропвае 32 *кг* ільну (калгас „Авангард").

Трапальшчыцы к-су „Авангард": Казлова Тэкля, Масюкова Марфа, Казлова Мар'я, Казлова Наста натропваюць у сярэднім па 24 *кг* у дзень.

бесьперапынна

дора, **Казлова** Таццяна—па 10 коп, вось табе і арытмэтыка, менш 8 коп ніхто не выпрацоўвае.

Разам з абмалотам—расьцілаем. Раніцой, калі яшчэ галоўкі сырыя, жанчыны абабіты лён сьцелюць, а старыя падвозяць на сьцелішча, галоўкі падсохнуць—зноў малоцяць.

Тры тыдні адлежваўся лён, потым падымалі са сьцелішчаў.

Самае галоўнае — апрацоўка ільну — яшчэ наперадзе. Але дзяды Міхась і Кузьма ўжо даўно рамантавалі старыя тры мялкі, рабілі новыя дзьве, перакладвалі печкі ў еўнях, лазьнях.

І калі да „авангардаўцаў" было даведзена канкрэтнае заданьне—адкрыць 8 мяльна-сушыльных пунктаў, выпускаць у дзень ня менш 5 *цнт* валакна, ужо усё было гатова.

Падлічылі рабочыя рукі і расставілі. На кожны пункт—два мяльшчыкі, адзін сушыльшчык, чатыры трапальшчыцы. Закіпела работа.

12 гадзін ночы. Паўночны вецер будзе на даху гумна, лазьні, тушыць агеньчык у ліхтарыку, залазіць пад кажух. А ў еўні цёпла. Лён ужо сухі. Зараз толькі мяць ды трапаць.

Загулі мялкі, траста жменямі бесьперапынна паступае ў мялку, адтуль кучаравы выходзіць лён, за ёю паступае другая, трэцяя жменя. Зьмяты лён паступова пераходзіць у рукі трапальшчыц.

Здаровыя, абветраныя твары трапальшчыц сьвецяцца задзёрам, жаданьнем да працы. Трапачкі мільгацяць у руках, выбіваючы кастрыцы, і толькі чыстае валакно застаецца.

У апрацоўцы ільну калгасьніцы „Авангарду" паказалі сапраўды бальшавіцкія тэмпы. **Бабкова Ганна пры норме ў 14** *кгр* **вытропвае 41** *кгр*. Бабаева Матрона вытропвае 38 *кгр*, бабуля Масюкова Марфа вытропвае 24 *кгр*, Бондарава Хвядора—33 *кгр*, Хмялёва Ганна — сыстэматычна выпрацоўвае 35 *кгр*.

Гэтыя тэмпы ёсьць вынік штодзеннай шырокай растлумачальнай працы праўленьня і камсамольскай ячэйкі па папулярызацыі пастаноў ЦК і СНК аб апрацоўцы і загатоўках ільну.

Кожны дзень працы ў калгасе дае новых герояў-ударнікаў.

Пільна сочыць за якасьцю апрацоўкі ільну брыгадзір тав. Бабкоў Сямён. Кепска абтрапаны лён калгасьніцамі Новікавай Аніськяй, Голубевай Волькай, Казловай Проськай быў вернут зноў на пункт для пераапрацоўкі.

Паляпшаюць якасьць сартаваньнем старыя ільнаводы спэцыялісты Бондараў Васіль, Папытоў Кузьма, Бондараў Ягор.

Праца ў калгасе арганізавана на дзьве зьмены. Адну пяцідзеўку працуе на ільне адна зьмена, а другую—другая.

У выніку ўдарнай працы калгас за 15 дзён да 14 лістапада пераапрацаваў і здаў дзяржаве 87 *цнт* **добраякаснага валакна і 20 лістапада апрацоўка ільну скончылася, плян здачы (продажу) ільну дзяржаве ў 106** *цнт* **выкананы.** Лён, які застаўся пасьля выкананьня абавязкаў перад дзяржавай, будзе разьмяркоўвацца паміж апрацоўваўшымі. **Шмат ільгот атрымалі калгасьніцы па ільне. 50 кап. у дзень акрамя працадзён выплачвалася акуратна, атрымалі таксама тканіну, мыла, галёшы. А калгас далкам, пасьля здачы прадукцыі, атрымае збожжа.**

Шмат у працы дапамагла насьценгазэта, якая арганізавала вакол сябе ўдарнікаў-селькораў.

Лён здаваўся 8 нумарам. Нумарнасьць, вядома, ня высокая. У далейшым барацьба за ўраджайнасьць, увядзеньне правільнага севазвароту, павышэньне нумарнасьці ільну — баявыя задачы калгасу.

Ударніца Казлова Вера абтропвае 31 *кг* (к-с „Авангард")

Калгас „Авангард", Калышанскага сельсавету, яшчэ малады. Толькі два гады 32 гаспадаркі былых аднаасобнікаў працуюць калектыўна, а ўжо маюць вялікія посьпехі. Дружна завіхаюцца каля ільну суседнія калектыўныя гаспадаркі, але **калгас „Авангард" упераддзе ўсіх.** Ён паказвае прыклад бальшавіцкіх тэмпаў работы, якасьці прадукцыі, сьвядомых адносін да працы на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Ударнікаў калгасу „Авангард" на чале з старшынёй Казловым Анісам неабходна прэміяваць.

Лёзна, к-с „Авангард", **К. М.**



Ільнацерабілка на палех ільнасаўгасу імя Вільямса Маскоўск. вобл.

Ударніца к-су „Авангард" Хмялева Яўгіньня абтропвае ў дзень 32 *кг* замест нормы 14 *кг*

Ліквідаваць ваенна-хэмічную няпісьменнасьць

АЎЛАДАЦЬ ТЭХНІКАЙ АБАРОНЫ

„Абвастрэньне імпэрыялістычных супярэчнасьцяй узмацняе тэндэнцыі ў лягеры імпэрыялізму вырашыць гэтыя супярэчнасьці за кошт СССР. Імпэрыялістычныя дзяржавы, і ў першую чаргу мілітарысты Францыі і Японіі, прыкладаюць усе намаганьні да пашырэньня і ўзмацненьня антысавецкага блёку, каб нанесьці рашучы ваенны ўдар базісу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі—СССР, які ўмацаваўся на сацыялістычным шляху. Ангельскі імпэрыялізм падтрымлівае ўсе пляны інтэрвэнцыі супроць СССР. ПАЗШ імкнуцца справакаваць япона-савецкую вайну, каб, паслабіўшы як Японію, так і СССР, умацаваць сваё становішча на Ціхім акіяне. У Польшчы, Румыніі, Чэха-Славаччыне і ў прыбальтыцкіх і балканскіх краінах вядзецца з максымальнай напружанасьцю ваенная падрыхтоўка пад кіраўніцтвам французскага генэральнага штабу. Манчжурыя ператворана намаганьнямі японскага імпэрыялізму, пры падтрымцы Францыі і Англіі, у пляцдарм для нападу на СССР. Адначасова пад кіраўніцтвам Францыі вядзецца непасрэдная падрыхтоўка інтэрвэнцыі супроць СССР у Польшчы, Румыніі, прыбалтыцкіх краінах і г. д. Над СССР вісіць пагроза непасрэднай ваеннай інтэрвэнцыі“ (з пастановы XII пленуму ВККІ).

Масавая ваенна-хэмічная ліквідацыя няпісьменнасьці праводзіцца сярод працоўных Асоавіяхімам і зьяўляецца першапачатковай формай вывучэньня ваенна-хэмічнай справы. Мэтай масавай ліквідацыі ваенна-хэмічнай няпісьменнасьці зьяўляецца азнаямленьне працоўных з характарам будучай вайны і ролью ў ёй хэмічнай зброі, вывучэньне галоўных сродкаў хэмічнага нападу, якія ўжываліся ў часе імпэрыялістычнай вайны 1914-18 гадоў, а таксама прынятых на ўзбраеньне ў радзе замежных армій ужо пасьля сканчэньня вайны, практычнае азнаямленьне з тэхнічнымі сродкамі абароны як асабістай, так і калектыўнай.

Трэба дабіцца таго, каб кожны працоўны ведаў, што прадстаўляе сабою хэмічная небясьпека, як ад яе трэба бараніцца. Асоавіяхім павінен навучыць, паказаць гэта, а таму павінна быць арганізавана выстарчальная колькасьць ваенна-хэмічных навучальных пунктаў, хэмічных гарадкоў, камэр акурваньня, хэмічных габінэтаў, куткоў, разгарнуць шырокую хэмічную прапаганду і ліквідаваць у самы хуткі час ваенна-хэмічную няпісьменнасьць. Калі мы арганізуем неарганізаванае працоўнае насельніцтва, то будзем упэўнены, што ў часе вайны ў нас кожны будзе на сваім посту, будзе ведаць як абараняцца ад нападаў ворага. Для гэтага мы павінны ўзмацніць хэмічную работу, а разам з гэтым і супроцьгазавую трэніроўку. У нас у большасьці супроцьгазавая трэніроўка заключаецца ў тым, што ў часе яе кожны працоўны пабывае 5 хвілін у процігазе і думае, што ён можа ўжо ўладаць супроцьгазам.

Але гэтага мала. Нам патрэбна трэніроўку зрабіць больш працяглай. У часе вайны трэба памятаць, што ў супроцьгазе нам прыдзецца бываць гадзінамі і выконваць неабходную працу. Перад намі стаіць задача, дабіцца, каб кожны працоўны ўмеў працаваць у супроцьгазе так, як ён працуе без яго. Гэту работу мы павінны праводзіць на фабрыках, заводах, калгасах, саўгасах, МТС, выкарыстоўваючы мэтад сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў правядзеньні масавай ліквідацыі ваенна-хэмічнай няпісьменнасьці. Кожная ячэйка Асоавіяхіму павінна дабіцца, каб працоўны праслухаў сэрыю гутарак па масавай ліквідацыі ваенна-хэмічнай няпісьменнасьці. Па гэтай праграме часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“ на працягу трох месяцаў зьмесьціць рад гутарак, якія неабходна кожнай ячэйцы Асоавіяхіму прапрацаваць для ліквідацыі ваенна-хэмічнай няпісьменнасьці.

Нач. ваенна-хэмічнага аддзелу
ЦС АСО **Маркавец**.

Прыкладная праграма заняткаў па ліквідацыі масавай ваенна-хэмічнай няпісьменнасьці

(20 гадзін)

Першы разьдзел: (4 гадзіны).

Тэма: Небясьпека новых войнаў у сьвятле пастаноў XII пленуму ВККІ, **характар будучай вайны і роля Асоавіяхіму ў абароне краіны.**

Мэта: Азнаёміць слухачоў у гуртку з пастановамі XII пленуму ВККІ аб міжнародным становішчы і аб небясьпецы новых войнаў, з ростам узбраеньняў капіталістычных краін (насычэньне агнявой моцы танкаў, авіяцыі, рост хэмпрамысловасьці і г. д.) і задачамі працоўных па ўзмацненьні абароназдольнасьці.

Другі разьдзел (7 гадзін).

Тэма: Баявыя хэмічныя матэрыі і сродкі іх прыстасаваньня.

Мэта: Даць тлумачэньне аб падзеле баявых хэмічных матэрый на атручваючыя, дымаўтвараючыя і запальваючыя. Падзел атручваючых матэрый на ўдушлівыя (хлёр, фасген, дыфасген), сьлёзатачывыя (хлёрапікрын, хлёрацэтафэнон), нарыўныя (іпрыт, люізіт і дзік), чыхальныя (адамсіт) і ядавітыя (сінільная кіслата і вокісь вугляроду).

Пры правядзеньні гэтай тэмы разабраць фізычныя і хэмічныя ўласьцівасьці кожнай атручваючай матэрыі, іх склад, сродкі атрыманьня, баявое прыстасаваньне. Дзейнічаньне атрутных матэрый на арганізм чалавека. Аказваньне першай дапамогі пры атручваньні. Ахова насельніцтва ад атрутных матэрый.

Палітыка савецкай улады па прыстасаваньні першых сродкаў хэмнападу (з баявога статуту ч. II).

Трэці разьдзел (8 гадзін).

Тэма: Тэхнічныя сродкі аховы чалавека і жывёлы ад атрутных матэрый.

Мэта: Вывучыць тыпы супроцьгазаў для чалавека і жывёлы, як асноўны сродак індывідуальнай аховы. Асноўныя часткі супроцьгаза. Значэньне вугалю і хэмпаглыналыніка супроць дымнага фільтру, дабавачнага патрона, гафрыванай трубкі, клапана, шлёма і інш. частак.

Апрача гэтага вывучыць правільнае хаваньне і догляд за супроцьгазам, перасьцярога яго ад вільгаці, адзяваньне, носка, сродкі дыханьня, працірка акуляраў. Вывучэньне папсаваных частак супроцьгаза і дыханьне ў атручаным паветры з папсаваным супроцьгазам і зьмена супроцьгаза ў атручаным паветры.

Ахоўчая вопратка—кабінэзон. Яго пабудова і ўжываньне. Работа ў кабінэзоне на атручанай мясцовасьці. Значэньне гумовых ботаў і рукавіц. Ахоўчая ўласнасьць усіх частак кабінэзону ад атрутных матэрый. Іх дэгазацыя пасьля праходжэньня праз заражаную зону.

Газасховы: разуменьне аб пабудове газасховаў і супроцьхэмічных абсталяваньнях. Прасьцейшыя сродкі супроцьхэмічнага абсталяваньня жылых і няжылых памяшканьняў. Правілы карыстаньня газасховамі і супроцьхэмічнымі абсталяванымі памяшканьнямі.

Чацьверты разьдзел: камернае акурваньне (3 гадзіны).

Пяты разьдзел: Органы СПА і партпалітработа (2 гадзіны).

Плян заняткаў

№	Назва тэм	Лік тэарыт. гадз.	Лік практ. гадзін
1	Характар будучай вайны, роля Асоавіяхіму ў абароне краіны .	4	—
2	Баявыя хэмічныя матэрыі і сродкі іх прыстасаваньня	6	1
3	Тэхнічныя сродкі аховы чалавека і жывёлін ад атрутных матэрый	6	2
4	Газавае акурваньне	1	2
5	Органы СПА і партпалітработа .	2	—
		19	5

Склаў **А. М.**

Барацьба за якасьць пераапрацоўкі ільну

Пераапрацоўка ільну складаецца з двух асноўных працэсаў: „мяцьця і трапаньня". Разгледзім кожны працэс паасобна і ўстановім правілы (прыёмы работы), захоўваючыя ад страт.

Пры сушцы неабходна апрача захаваньня супроцьпажарных мер строга захоўваць тэмпэратуру ў сярэднім 50 градусаў. У пачатку сушкі можна дапусьціць большую тэмпэратуру (60°), але пад канец яна павінна зьнізіцца.

Прасушанай трасьце неабходна даць адляжацца (1 дзень), каб захаваць яе пры далейшай апрацоўцы ад вялікага процанту адыходаў.

Работа мялкі—адказьнейшы вучастак, таму ў мэтах атрыманьня лепшай якасьці і меншых страт неабходна, акрамя правільнай устаноўкі і рэгуляваньня мялкі, праверыць, каб на рыфлях валаў ня было драпін і зазубрын, зьнішчыўшы іх *напільнікам* і наждачнай паперай.

У выпадку ўстаноўкі новай мялкі неабходна працісьнуць яе на шырокароснай трасьце, даўшы адшліфавацца рыфленым валікам.

Правільна даглядаць мялку: сваячасова чысьціць, не дапушчаць наматваньня на валы, змазваць падшыпнікі праз кожныя 4 гадзіны работы, не дапушчаць звыш 80 зваротаў у хвіліну для слабой і 100 зваротаў для моцнай трасты.

Ня зьмешваць гатункі трасты, прапускаючы кожны гатунак паасобна.

Пры падачы ў мялку трасты асаджваць жменю ўдарам камля аб падвальны столік.

Не рабіць жмень больш 400 грам.

Пры выхадзе з мялкі сырэц укладваць акуратна, ня блытаючы яго.

Рэгуляваць мялку (ступень націску валікаў) у залежнасьці ад ступені валежкі трасты, чым траста мацней (недаляжалая ці тонкая), тым большы павінен быць націск і наадварот.

Прамятая траста-сырэц павінна адляжацца 3—5 дзён. Неадляжалы сырэц дае шмат адыходу і зьніжае якасьць валакна, апошняе атрымліваецца пуклявае, не масьляністае.

Перад трапаньнем жменю неабходна скалануць і вытрасьці кастрыцу, якая слаба трымаецца.

Трапаньне трэба пачынаць з вяршалінак сьцябла, бо яны цяжэй апрацоўваюцца.

Сьцябло павінна быць такой велічыні, каб пры трапаньні валакно не вырывалася з рукі.

Трапаць трэба ў два прыёмы: 1) падтроп (начорна) менш кваліфікаванымі і 2) трапаньне начыста—кваліфікаванымі трапальшчыцамі.

Пры трапаньні апрача ўказаных правіл неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на рэгуляваньне сілы і догляд машыны.

Харламаў

Дэлегаткі, калгасьніцы, працоўныя аднаасобніцы!

Змагайцеся за павышэньне якасьці апрацоўкі ільну, за сваячасовую здачу яго дзяржаве

РАБОТНІЦЫ, УКЛЮЧАЙЦЕСЯ Ў АГЛЯД МЭДЫЧНА-ПРАФІЛЯКТЫЧНАЙ ДАПАМОГІ

ЦСПСБ, ЦКК-РСІ, Наркамаховы здароўя, ЦП саюзу мэдсанпрацы і рэспубліканскай касай сацстраху праводзіцца грамадзкі агляд становішча лекава-прафіляктычнай дапамогі рабочых па БССР. Задачы агляду—праверыць выкананьне ранейшых дырэктыў ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ, ЦКК-НК РСІ ў галіне перабудовы лекава-прафіляктычнай дапамогі рабочых.

У сувязі з гэтым па БССР (у Менску, Барысаве, Гомелі, Віцебску) праводзіцца агляд раду больніц, паліклінік, мэдычных і страхавых пунктаў і дыетхарчаваньня на буйных прадпрыемствах. Абсьледуюцца таксама асобныя дыетдыспансэры, сухотны, радзільныя дамы, дзіцячыя дыспансэры, псыхадапамога і эпідэмічнае становішча, дамы адпачынку і санаторыі.

Па рэспубліканскай касе сацстраху будуць агледжаны курбюро і паасобныя ЦП саюзаў і ФЗК, як разьмеркаваны месцы ў дамы адпачынку і курорты ў 1932 годзе.

Такім чынам, побач з аглядам становішча лекава-прафіляктычнай дапамогі праводзіцца агляд асобнай галіны мэддапамогі, якая датычыць выключна амаль што работніцы, як радзільныя дамы, дзіцячыя дыспансэры, у добрай рабоце якіх работніца павінна быць асабліва зацікаўлена.

У гэтым грамадзкім аглядзе наша задача—высьветліць сапраўднае становішча лекава-прафіляктычнай дапамогі ўсім рабочым і, у прыватнасьці, работніцам.

Як аказвалася прафіляктычная дапамога ў летні час работніцам? Ці ўсе хворыя работніцы атрымалі лячэньне, дамы адпачынку, санаторы?

Як абслугоўваецца наогул лекава-прафіляктычнай дапамогай работніца-ўдарніца, ці атрымлівае яна дапамогу ў першую чаргу.

Мы добра ведаем аб тым, што ў пытаньні аказваньня лекава-прафіляктычнай дапамогі ёсьць многа недарэчнасьцяй, якія могуць быць зьнішчаны ня толькі аглядамі, а галоўным чынам актыўным удзелам у гэтай справе саміх застрахаваных, у прыватнасьці, актыўным удзелам работніц у штодзеннай працы лекава-прафіляктычных устаноў, як кажуць „на-ходу выпраўляць памылкі".

Надаючы надзвычай важнае значэньне гэтаму мерапрыемству, цэнтральная брыгада ставіць пытаньне аб удзеле шырокіх колаў рабочых-ударнікаў, работніц-ударніц, лепшых спэцыялістаў з мэдпэрсаналу ў гэтым аглядзе.

Работніцы, пішэце аб становішчы мэддапамогі, працы страхпункту, дыетхарчаваньня, становішчы радзільных дамоў, лячэбнай дапамозе сухотным у сваю часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі", у цэнтральны і раённы друк і вашы насьценгазэты!

Так вы дапаможаце высьветліць становішча лекава-прафіляктычнай дапамогі рабочым.

Е. Кантаровіч.

Папраўка

У № 31-176 на старонках 8—9 пад вытрымкамі аб уздыме ўраджайнасьці папісана: „З пастановы ЦК КП(б)Б", трэба чытаць—з пастановы ЦК УсеКП(б).

Рэдакцыя.

Неадкладна аздаравіць работу Вузьдзенскай райбольніцы

Рэдакцыя газэты „Калгасьнік Вузьдзеншчыны" арганізавала брыгаду рабселькорак для агляду становішча раённай больніцы.

Брыгада высьветліла многа недахопаў. Асноўнае—гэта адсутнасьць працоўнай дысцыпліны сярод абслугоўваючага пэрсаналу. Ніхто не адчувае адказнасьці за даручаемую работу.

Аб адсутнасьці дысцыпліны выразна гаворыць наступны факт. Доктар тав. Лапкоў пасылае санітарку Аксану ў аптэку па лякарства. Санітарка—адмаўляецца, кажучы: „Мне трэба вокны ўстаўляць". Калі-ж доктар настойваў, каб лякарства было прынесена, ён атрымаў грубы адказ ад санітаркі: „тады сам устаўляй вокны".

Няма дысцыпліны і сярод сёстраў. Сястра Дубовік ня ідзе ў заразны барак пакуль яе не пакліча санітарка. Акушэркі ў часе дзяжурства ідуць сабе дамоў. Быў выпадак, калі жанчына радзіла бяз усякай дапамогі акушэркі і ледзь не памерла ад крывацечы.

Мясцком ніякіх мер не прымае для падняцьця працдысцыпліны. Вакол гэтага пытаньня не стварылі грамадзкай думкі, не правялі масавай работы.

Хворыя нам расказвалі, што дактары адносяцца добра да хворых, а сёстры і санітаркі кепска. Санітарка Ніна груба і дрэнна адносіцца да хворых.

Нядобрасумленна сёстры адносяцца да выкананьня назначэньня доктара. Лякарствы замест двух—трох раз у дзень даюцца адзін раз.

У радзільным пакоі холадна, парадзіхі прастуджваюцца. Часта санітаркі адсутнічаюць і хворым прыходзіцца злазіць з ложка за вадой або па іншых патрэбах. Былі выпадкі, калі хворыя самі сабе ставілі клізмы, бо сястры ня было.

У радзільным пакоі няма належных прылад для сцэджваньня малака. Няма матрацаў, і парадзіхам прыходзіцца везьці з сабой салому, каб не ляжаць на голых дошках.

Асабліва груба адносіцца да пэрсаналу і да хворых загадчык гаспадаркі Ягодка. Наведвальнікаў да хворых ён пускае па знаёмству. А калі-ж прыяжджае з вёскі незнаёмы, то нават толкам не адкажа. Гэты загадчык гаспадаркі „эканоміць" газу. Быў выпадак, калі жанчына з хворым дзіцем сядзела ў цемнаце.

Летам рамонту не зрабілі, а ён робіцца зараз. Адчыняюць дзьверы і вокны пакояў, дзе ляжаць

ПАЧЫНАЕМ ГРАМАДЗКІ АГЛЯД
становішча дзіцячых устаноў

Цэнтральны савет прафсаюзаў БССР распачаў грамадзкі агляд становішча дзіцячых устаноў—ясьляй і ачагоў.

Задача агляду—выявіць ці прыстасавана праца дзіцячых устаноў да бытавых умоў работніцы, вучобы і грамадзкай работы. Ці задаволены работніцы маткі дзіцячымі ўстановамі, ці даецца перавага работніцы-ўдарніцы ў прыёме яе дзіцяці. Хто накіроўвае дзяцей у ясьлі і сады (ФЗК, ці кожная матка асобна)?

Якое становішча з забесьпячэньнем дзіцячых устаноў: ці выконваюцца нормы Наркамснабу? Ці ёсьць сьвінарнікі, трусатнікі? Як вядуцца самазагатоўкі, як дапамагае ЗРК пры прадпрыемствах дзіцячым установам прадуктамі.

Як стаіць справа з фінансаваньнем дзіцячых устаноў,—гэта значыць як выдаткоўваецца мясцовы бюджэт, сродкі Фубра (1/4 проц. адліку з выплачваемай зарплаты на тых прадпрыемствах, дзе працуе звыш 100 рабочых). Як паступаюць бацькаўскія сродкі. Як выконваецца санітарны мінімум у дзіцячых установах, і ці ёсьць ізалятары для прыёму хворых дзяцей.

Як змагаюцца дзіцячыя ўстановы з прагуламі матак-работніц на вытворчасьці.

Адносіны і дапамога прафсаюзных, гаспадарчых арганізацый да дзіцячых устаноў. Рабочы і грамадзкі кантроль. Як кіруюць дзіцячымі ўстановамі органы аховы здароўя і нарасьветы.

Гэты грамадзкі агляд можа быць выканан цалкам толькі тады, калі ў ім прымуць удзел ня толькі брыгады, вылучаныя ЦСПСБ, але і прафсаюзны і жаночы актыў, дэлегаткі і самі маткі-работніцы.

Цэнтральнай брыгадай ЦСПСБ будзе праведзен агляд становішча наступных дзіцячых устаноў: ў Менску дзіцячых садоў № 4, 7, 6 і польскага, ясьлях швэйнай фабрыкі „Кастрычнік", шчотачнай і ясьляй № 1.

У Бабруйску: дзіцячага саду і ясьляй на дрэваапрацоўчым камбінаце, швэйнай фабрыкі імя Дзяржынскага, дзіцячага саду і ясьляй, якія знаходзяцца на каштарысе Гарана.

У Віцебску: дзіцячага саду і ясьляй на фабрыцы „Дзьвіна", дзіцячага саду на фабрыцы імя Клары Цэткін, ясьляй пры „Сьцягу індустрыялізацыі".

У Барысаве: дзіцячага саду і ясьляй на фабрыцы „Бярэзіна" і заводзе імя Домбаля.

У Гомелі: дзіцячага саду і ясьляй у Нова-Беліцы і ясьляй „Чырвоны Кастрычнік".

У Магілеве: ясьляй швэйнай фабрыкі і дзіцячага саду пры Гарана.

Надзвычай вялікую ролы павінна адыграць у далейшым разьвіцьцё дзіцячых устаноў, становішча дашкольна ясельнай каапэрацыі, агляд якое таксама праводзіцца цэнтральнай брыгадай.

Маткі-работніцы, працаўнікі дзіцячых устаноў, праз друк, у прыватнасьці сваю часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі" пішэце аб дасягненьнях і недахопах у працы ясьляй і дзіцячых ачагоў. Уключайцеся ў агляд. **Кантаровіч.**



Кацельны цэх фабрыкі „Камунарка".

Неадкладна аздаравіць работу Вузьдзенскай райбольніцы

(працяг)

хворыя. Адно дзіця прастудзілася і захварэла васпаленьнем лёгкіх.

Ягодка не выдае цёплых коўдраў, якія ёсьць у яго, і хворыя накрываюцца халатамі і чым папала. Для санітарак ён зусім мыла не дае, асабліва ў заразным бараку, дзе гэта вельмі патрэбна.

Бялізна брудная і рэдка мяняецца, хворыя накрыты брудными коўдрамі. У заразным бараку асабліва брудна. Пад вокнамі зрабілі прыбіральню. Памыі выліваюць каля ганку, там-жа валяюцца кучы сьмецьця.

Гаспадарчае становішча дрэннае. Дровы не загатоўлены.

Ніякай масавай работы з абслугоўваючым пэрсаналам і хворымі не праводзіцца.

Брыгада адзначае, што такое агіднае становішча зьяўляецца вынікам безадказнасьці тых людзей, якім даручана ахова здароўя нашага раёну. Загадчык райбольніцы тав. Ліўшыц, загадчык гаспадаркі тав. Ягодка, старшыня мясцкому саюзу мэдсанпрацы тав. Герасімовіч бязьдзейнічаюць. Асобныя акушэркі Гразоўская і іншыя сёстры і санітаркі таксама нядбайна адносяцца да даручанай ім работы.

З боку РВК было слабае кіраўніцтва райбольніцай. Даклад загадчыка больніцы заслухоўваўся толькі ў сакавіку, ня было штодзеннага нагляду за больніцай.

Брыгада лічыць неабходным, каб РВК узмацніла кіраўніцтва больніцай. Мясцком саюзу мэдсанпрацы павінен масава абгаварыць становішча райбольніцы і мабілізаваць усе сілы, каб ліквідаваць усе недахопы. Трэба неадкладна наладзіць працдысцыпліну, каб кожны адчуваў адказнасьць за даручаную работу.

За грубасьць і безгаспадарчасьць загадчыка гаспадаркі Ягодка трэба прыцягнуць да адказнасьці. Трэба палепшыць санітарнае становішча і разгарнуць масавую работу сярод пэрсаналу і хворых. Таксама трэба правесьці растлумачальную работу па прафіляктыцы ў бліжэйшых калгасах.

Брыгада рабселькорак: **Кавалёва, Аліпкевіч Ядзя, Коржэль Зося, Місьнікевіч, Сульлер, Ганддова, Слабодзіна.**

Дайце чалавеку размахнуцца

Жыў-быў калісьці на сьвеце заўзяты начальнік. Гэта, праўда, было даўно. Аб гэтым начальніку яшчэ Салтыкоў-Шчэдрын пісаў. Ў тыя далёкія часы заўзятыя начальнікі кіраваліся двума асноўнымі правіламі. Першае з іх заключалася ў тым, што:

— Чым больш начальнік шкоды робіць, тым больш айчыне карысьці прыносіць. Горад спаліць—карысьць, насельніцтва перапалохае—зноў такі карысьць.

І другое правіла.

— Як мага болей мець у сваім распараджэньні мярзаўцаў. Абываталі, моў, сваёй справай заняты, ну а мярзаўцы людзі такія, што ва ўсякі час да шкоды надзвычай здатныя.

Трапілася так, што заўзятасьць гэтага начальніка стала ўсім добра вядомай. І далі ў яго распараджэньне і кіраўніцтва край. Прыехаў начальнік у свой край і пачаў шкодзіць. Народнае харчаваньне спыніў, ахову народнага здароўя ліквідаваў, навукі спаліў і попел па сьвеце ветры разьнесьлі.

Каапупаўнаважаны цэху фабрыкі „Кастрычнік" Дыпэрштэйн ня зусім здатны на такія рэчы. Яму далёка да заўзятага начальніка. Праўда, ад яго гэтага і патрабаваць нельга. Не адразу-ж і заўзяты начальнік пачаў паліць гарады. На ўсё трэба практыка, навука. Дайце спачатку чалавеку як належыць размахнуцца, увайсьці ў сілу, а затым ужо патрабуйце ад яго здатнасьці і выключнай таленавітасьці. Гэта ясна. Тут няма да чаго прычапіцца.

І яшчэ больш ясна, што з Дыпэрштэйна можа выйсьці ня дрэнны начальнік. Ну, мабыць, у яго наконт заўзятасьці і будзе крыху слабей, чым у таго, аб якім пісаў Шчэдрын. Але хіба ў гэтым галоўнае. Дыпэрштэйн можа і не адважыцца гарады паліць, каб каменя на камені не пакінуць, навукі ліквідаваць, ахову здароўя зноў такі зьнішчыць.

На гэта патрэбна выключная адвага. Такой адвагі ў Дыпэрштэйна няма—аб гэтым няма чаго і гаварыць. Чаго няма, дык няма. Уся бяда ў тым, што ён абмежаваны надзвычай вузкімі рамкамі—вось табе каапкамісія, размахніся тут, як хочаш. Няма размаху, няма тых прастораў, што меў сапраўдны шчэдрынскі начальнік.

Але трэба і ў гэтых вузенькіх рамках умець сябе паказаць. Лацьвей якомусьці начальніку было паліць гарады.

Дыпэрштэйну куды больш складана выконваць свае пляны. Што ні зрабі, адразу ўзьнімаецца шум, вэрхал. Іншыя нават крычаць—няправільна.

Вось аднойчы да яго прышла работніца—Волк за талёнам на туфлі.

— Туфлі?!—а трасцы ня хочаш—забушаваў у асобе Дыпэрштэйна заўзяты начальнік.—Дзесяць руб. ты на карысьць палітзьняволеных унесла?

— Унесла—сказала Воўк.

— Дзесяць руб. на карысьць Чырвонай арміі ўнесла?

— Унесла.

— Значыць, у цябе грошай многа, што ты такая шчодрая. На рынку купіць можаш!—закрычаў Дыпэрштэйн. — Я, нават, магу расказаць, як гэта патрэбна зрабіць—больш ветліва дадаў ён.—Трэба пайсьці на рынак выбраць туфлі і заплаціць грошы—і Дыпэрштэйн падміргнуў вокам.—Вось, моў, глядзеце, які я добры.

Выправіўшы за дзьверы работніцу-ўдарніцу Волк, Дыпэрштэй перайшоў да чарговай справы...

Так часамі адносяцца да жанчын-актывістак. Ці трэба гаварыць аб шкоднасьці такіх „адносін", аб тым, што яны зьяўляюцца рэзультатам прошукаў клясавага ворага.

Жанчына-актывістка, тым больш работніца-ўдарніца завявала сабе права на актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве і ніякія Дыпэрштэйны ня могуць адняць у яе гэтага права.

У тым горадзе, дзе, — як сьцьвярджае Шчэдрын, — жыў заўзяты начальнік, жыла чараўніца, якая гадала на кафэйнай гушчы і адначасна ўмела на месца ставіць мазгі. Бывала, як разыдзецца заўзяты начальнік і ў яго галаве адразу зьявяцца сотні новых праектаў, так што ён ня ведае ва які ўхапіцца, тады ён бяжыць да чараўніцы. Тая пашукае-пашукае, знойдзе на галаве ў начальніка дзірку. Узьніме кляпан, сьвісьне адтуль і выляцяць лішнія праекты. І начальнік прыходзіць у нармальнае становішча.

РСІ павінна Дыпэрштэйну паставіць на месца мазгі.

Кузьма Пруцікаў.

Што расказваюць работніцы з агрэгату шырспажыву ф-кі „Кастрычнік"

Работніца Віцько кажа: „З першых дзён працы ў агрэгаце я ніяк не магла згадзіцца шыць з маленькіх кавалкаў. Сшывала тады па 1-2 коўдры ў дзень, а вараз—ужо 4-5, і няма цяпер ніводнай работніцы, якая шыла-б менш гэтай нормы. Мы штодзенна свой прамфінплян перавыконваем.

За трэці квартал па шырспажыве прамфінплян выканан на 117 проц., а за кастрычнік—на 101,8 проц. Мы маем усе магчымасьці скончыць прамфінплян гэтага году па ўсіх паказальніках датэрмінова да 25-га сьнежня 1932 году.

Дрэнна тое, што інструктар Кунігнэр няправільна разьмяркоўвае кавалкі. Ёсьць частыя выпадкі, калі адна работніца атрымлівае вялікія кавалкі для пашыўкі дзіцячых коўдраў, а другія работніцы—зусім маленькія ў той час, калі неабходна рэгуляваць, каб кожнаму папаліся і вялікія і маленькія кавалкі. Работніцы ня раз указвалі на гэта ненармальнае зьявішча, але-ж да гэтага часу нічога ня зроблена. Начальнік цэху тав. **Трэйбіч** мала зварачае ўвагі. Мы рэдка яго бачым у цэху.

Брыгадзір па пашыўцы дзіцячых коўдраў тав. Жыліна кажа: „Раней былі частыя спазьненьні і прагулы з боку паасобных работніц, бо частка не жадала працаваць у гэтым цэху—сшываць з маленькіх кавалачкаў коўдры. Яны лічылі, што будзе нізкая заработная плата. Зараз аказалася наадварот, кожная работніца выконвае свой прамфінплян і больш зарабляе, чым раней. Таксама ліквідавалі спазьненьні і прагулы. Наша брыгада штодзенна зьбіраецца і абгаворвае плян па колькасьці і якасьці і высоўвае сустрэчнае заданьне. Работа ўціль-цэху пастаўлена вузорна.

Грумбіна

„ЗЯБКІ“

Між невялічкіх узгоркаў, якія дзе-ні-дзе падмяняюцца лагчынкамі, пасялілася 17 купін-двароў аднаасобнікаў пад назвай вёскі „Зябкі“. Як толькі пачынае сьвітаць ды часта і да сьвітаньня ў хатах застаюцца толькі малыя, усе іншыя заняты ільном, які сьпяшаюцца апрацаваць і хутчэй здаць. І толькі позна ўвечары хаты здалёк пачынаюць сьвяціцца агнямі, людзі зьбіраюцца на адпачынак. „У мяне вёска „Зябкі“ ўдарная—з гонарам заяўляе старшыня Калышанскага сельсавету тав. Новікаў,—а людзі ў ёй яшчэ лепшыя“. І сапраўды аднаасобнікі—беднякі і сераднякі вёскі паказваюць узоры працы, узоры выкананьня абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай.

Добра праведзеная масавая работа з боку парт'ячэйкі і сельсавету па растлумачэньні пастаноў партыі і ўраду дала свае вынікі. Яшчэ вясною, як толькі былі даведзены пляны сяўбы, аднаасобнікі энэргічна ўзяліся за працу. На плян пасеву ільну ў дванаццаць гэктараў высунулі сустрэчны ў 14 *га*. Разьмеркавалі пасеў паміж гаспадаркамі і прыняліся за выкананьне. Вырас лён, жанчыны яго прапалолі. Дый лянок удаўся ня кепскі—расказваюць аднаасобніцы, — чысьценькі, травы зусім мала. Сваячасова абмалацілі, разаслалі, паднялі.

— Парашылі не адставаць ад калгасу—расказвае цётка Аніська Казлова. — І ня ўгледзелі, як зьмялі, памагалі адзін аднаму, агулам неяк лепш выходзіла. Праўда, некаторыя і зараз яшчэ мнуць, як бабуля Марына Голубева—70 год—дык мы ёй зараз усе дапаможам і плян выканаем.

Заданьне вёска мае 22 *цнт*, і ўжо на 14 лістапада здана 16,5 *цнт*, што складае 75 проц. пляну.

Асабліва добрымі адносінамі да выкананьня абавязкаў перад дзяржавай вызначаюцца жанчыны гэтай вёскі. Некаторыя з іх пляны ільназагатовак перавыканалі ў два разы. Варта аб іх сказаць пару слоў. **Казлова** Аніська—сям'я чырвонаармейца—засеяла ільну 0,5 гэкт. Паводле пляну **павінна была здаць 0,9 валакна, а здала 1,65 цнт.** Сама Аніська (ёй 53 гады) ды нявестка, самі мялі на ручной мялцы, чыста вытрапалі і здалі ўсё валакно дзесятым нумарам.—Дый

Аднаасобніца вёскі „Зябкі“ Казлова Аніська здала валакно звыш пляну.

сабе яшчэ пакінула на сёе-тое, ручнічок, абрус і іншую дробязь—кажа Аніська. Аніська ў вёсцы не адна.

Ганна Вінаградава замест пляну ў 0,8 *цнт* здала 1,36 *цнт*. Ліда Бычанкова замест 1,2 *цнт* здала 1,60 *цнт*.

Перавыканалі таксама пляны аднаасобнікі **Голубеў Яўхім, Асташонка Апанас** і іншыя. Партячэйка і сельсавет маюць у „Зябках“ моцную апорную базу—актыў беднякоў і сераднякоў, якія вядуць за сабой усю вёску. Член сельсавету актывіст тав. Масюкоў Мікіта паводле пляну павінен здаць 1,6 *цнт* ільну, а здаў 1,65 *цнт* і падрыхтаваў да здачы яшчэ 16 вязанак.

Лепшы актывіст Бычанкоў Рыгор павінен быў здаць 1,2 *цнт*, здаў 1,75 *цнт*, пры гэтым ільну добрай якасьці № 12. Ён атрымаў за лён 148 рублёў грошай, 12 пудоў жыта і шмат прамтавараў. Вёска зьяўляецца прыкладнай ня толькі па выкананьні пляну ільназагатовак. Плян бульбазагатовак выканан з перавышэньнем. Замест 50 *цнт* здана 54 *цнт*, збожжа замест 33 пудоў здана 41 пуд. Зазяблена 18 *га*. Па здачы гародніны плян перавыканан.

Вёска цалкам заплаціла падатак, страхоўку і іншыя плацяжы, падпісалася на пазыку на 320 руб.

Плян ільназагатовак у бліжэйшыя дні будзе выканан аўтарытэтна—заявілі вясковыя актывісты, **Масюкоў і Бычанкоў.**

— Агулам неяк лепш выходзіць — заявіла цётка Аніська Казлова, калі казала пра апрацоўку ільну ў вёсцы. І сапраўды, Аніська мае рацыю—агулам лепш выходзіць. **Вёска „Зябкі“ зараз узмоцнена рыхтуецца да ўступленьня ў калгас.**

На прыкладзе іншых калгасаў „зябкаўцы“ ўбачылі перавагу калектыўнай працы. Сёнешні аднаасобнік—заўтрашні калгасьнік—гэта лепш за ўсё відаць на прыкладзе вёскі „Зябкі“. Чацьвертую бальшавіцкую сяўбу аднаасобнікі рыхтуюцца сустрэць у калгасе.

К. М.



Новы элеватар у Рубцоўцы (Зах. Сібір)

Дэлегаткі, работніцы, калгасьніцы, аднаасобніцы, пішэце аб вопыце барацьбы за сваячасовую апрацоўку і здачу ільну дзяржаве

На дзіцячым ранішніку

Пазьней чым заўсёды зьбіраліся дзеці. Па іх нэрвовых рухах і асаблівай сур'ёзнасьці адразу можна заўважыць чаканьне асаблівага зьявішча, што вельмі рэдка сустракаецца ў жыцьці. Чырвонымі кветкамі гараць прыгожыя маленькія тварыкі. Апранутыя ў чысьценькую рознакаляровую вопратку, яны носяць пячатку асаблівай урачыстасьці і вялікага сьвятошнага настрою.

Радасна турбуючыся, дзеці жвава перабягаюць з пакою ў пакой і важна шэпчуцца з дарослымі. Але больш за ўсіх мітусіцца ўлюбёная цёця Поля—загадчыца саду. Да пачатку ранішніка застаецца некалькі хвілін. Патрэбна праверыць падрыхтаванасьць.

... У дзіцячым садзе сёньня ня толькі адны дзеці. Сустрэць вялікае сьвята яны запрасілі і бацькоў сваіх, каб падзяліць з імі агульную радасьць, каб паказаць ім свае здольнасьці і дасягненьні.

* * *

З вялікім задаваленьнем глядзелі дзіцячае мастацтва, сачылі за кожным гэстам і рухам маладых „артыстаў". Іх разумныя твары пакідаюць нязгладнае ўраджаньне. Глыбокае разьвіцьцё дзіцячага розуму прыкоўвае ўвагу гледача. Просьценькая інсцэніроўка перараджэньня вёскі прымушае вас перажываць больш, чым у любым тэатры.

... У маленькім кругу імправізаванай сцэны важна крочыць за сахою адзінокі араты — чорнавокі Грыша. Вышыня яго росту аднолькавая з сахою. За ім ідзе сейбіт—блёндыністы Віця, нагнуўшыся пад цяжарам мінімага кашаля з зернем і шырока размахвае рукамі... Неяк съмешна бачыць жаданьне падражаць даросламу. Але дзеці так захоплены сваёй справай, што на хвіліну прымушаюць забыцца і даросламу.

Пяцігадовыя дзяўчаткі—Тома і Ліля—паказваюць вам прыклад жаночай працы ў летні час. З ранку да вечара працоўная сялянка гнула сьпіну пры ўборцы ўраджаю старым спосабам. І маладыя „артысты" крыху стогнуць, махаючы драўляным серпікам.

А зараз вёска ня тая. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі карэнным чынам перабудоўваецца сельская гаспадарка. Яе разьвіцьцё накіравана па сацыялістычным шляху. У калгасах на базе машыннай тэхнікі аблегчана праца чалавека і паляпшаецца дабрабыт. І дружны звон дзіцячых галасоў радасна дэклямуе:

„Наша вёска з тэй пары,
не завецца Тахтары,
ад зары і да зары
там працуюць трактары.
У калгасе працы многа—
Ён завецца „Перамога".

Бацькаўскія твары зьзяюць радасьцю. Бурнымі воплескамі пакрываецца апошняя сцэнка—праца трактара і камбайна ў калгасе. Сваім выступленьнем дзеці пакінулі глубокае ўражаньне надоўга.

Ня меншае ўражаньне пакінула і другая сцэнка—праца заводзкага канвэера па выпуску машын. Цяжка сабе ўявіць з якім чуцьцём адказнасьці наматала істужку-пас сямігадовая Акцябрына.

Арганізаваная выстаўка дзіцячых работ наглядна паказала правільнасьць камуністычнага выхаваньня па прынцыпе злучэньня тэорыі з практыкай і прышчапленьня дзецям вытворчых навыкаў. Тут будынкі, трактары, аўтабусы і іншыя рэчы. Шасьцігадовыя „будаўнікі" адчуваюць сябе зусім дарослымі. З вясёлымі тварыкамі яны з асаблівым гонарам запэўняюць:

— Мы пабудуем шмат заводаў,
фабрык, машын, трактароў,
ударна мы ў чатыры годы
закончым плян пяці гадоў.

Бацькі задаволены. Ніякая песьня і музыка не стварае такога настрою, як выступленьне гэтых маладых будаўнікоў і артыстаў. Ніводная мітынговая прамова не запаліць так сьвяточным энтузіязмам, як дзіцячы сьпеў пралетарскаму Кастрычніку:

— ... Грайце аркестры, вышэй
штандары
Сёньня дзень славы Кастрычнік,
„ребята",
сьвяткуем перамогу, перамогу
працы...

Паміж двума пакаленьнямі ўстанавілася поўная сувязь. Бацькі разам з дзецьмі сьпявалі гэты сьпеў, урачыста сьвяткуючы 15 гадавіну перамогі працы над капіталам у краіне Саветаў.

Вучні

* * *

Ранішнік адкрыўся кароткім рапартам загадчыцы. Дзіцячы сад гарана № 23—у Менску— да 15 гадавіны значна вырас і мае значныя дасягненьні. Замест дзьвёх груп у мінулым годзе ў садзе зараз—3 групы з колькасьцю 80 дзяцей. Па сацыяльным складзе—большасьць дзяцей рабочых, работніц, настаўнікаў і малы процант дзяцей служачых. З 1931 году сад перайшоў на бесьперапынны тыдзень.

Разам з дарослымі маладыя будаўнікі прымаюць удзел у гаспадарча-палітычных кампаніях—у пасеўнай, праполачнай, уборачнай, дарожным будаўніцтве і падпісцы на пазыку. Вясной старэйшыя групы зьбіралі попел, каменьні, уцільсырэц. У часе праполкі некалькі бацькоўскіх брыгад разам з дзецьмі дапамагалі калгасу. Усе дзеці калектыўна падпісаліся на пазыку (унесьлі ад 10 да 20 кап.). Старэйшыя маюць і білеты МОПР'у.

Сад мае цесную сувязь з прадпрыемствам, піянэр-атрадам і школай. Старэйшыя групы выпускаюцца акцябратамі. Да 15 гадавіны ўсе дзеці абвясьцілі сябе ўдарнікамі. Бацькі ўцягнуты ў дашкольную кампэрацыю.

Абсталяваньне саду адпавядае цалкам палітэхнічнаму выхаваньню. Ёсьць майстэрня, дзе дзеці ўпяршыню навучаюцца працаваць. Даволі цацак. Значна палепшана абслугоўваньне дзяцей, выхавальніцы зацікаўлены сваёй работай.

Менск. **Ткачэнка.**

Правільна захоўваць насеньне ільну

Ільнаводства да вайны 1914 году было самым адсталым вучасткам сельскай гаспадаркі. Толькі ў Савецкім Саюзе, на аснове будаўніцтва саўгасаў, калгасаў, шырока разьвілося ільнаводства. З ростам ільнаводных буйных калгасаў і саўгасаў падводзіцца база для мэханізацыі ўсіх прыёмаў вырошчваньня, а таксама і апрацоўкі ільну. Пастаўленая партыяй і савецкай уладай задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў цесна зьвязана з задачай павышэньня ўраджайнасьці і ўкараненьня ва ўсе працэсы вырошчваньня ільну навейшых дасягненьняў агранамічнай навукі. Пытаньні мэханізацыі ўборкі і апрацоўкі ільну, пытаньні агратэхнікі маюць вялізарнае значэньне. У гэтым артыкуле мы разгледзім, як трэба правільна захоўваць насеньне ільну да будучай веснавой пасеўнай кампаніі. Трэба памятаць кожнаму, што ад правільнага захаваньня насеньня ільну залежыць яго якасьць, як насеннага матар'ялу, а разам з тым і атрыманьне належнага ўраджаю.

У справе захаваньня насеньня ільну ёсьць два спосабы — гэта ў мяшкох і ў засеках. Пры хаваньні ільну памяшканьне павінна здавальняць такім запатрабаваньням: па-першае, само памяшканьне павінна быць сухім, а, па-другое, яно павінна мець вэнтыляцыю.

Мы ведаем, што сабранае насеньне яшчэ ня скончыла свой працэс пасьпяваньня. Пасьпяваньне насеньня заканчваецца толькі да веснавой сяўбы. Таму ў момант захаваньня ільну трэба даць усе неабходныя ўмовы для найлепшага пасьпяваньня насеньня.

Адначасова пры захаваньні насеньня ільну трэба ведаць яго вільготнасьць, бо ад гэтага залежаць умовы захаваньня. Насеньне ільну, калі яно мае вялікі процант вільготнасьці, хутка псуецца. Але пры ўжываньні некаторых захадаў гатага можна і не дапусьціць.

Пры тым, калі насеньне ільну мае вялікую вільготнасьць, хаваць яго патрэбна не ў мяшкох, а выключна ў рассыпку—тонкім пластом. Прычым памяшканьне павінна быць сухім. Насеньне пры такіх умовах захаваньня трэба часта пераварочваць, а само памяшканьне праветрываць.

Калі насеньне, якое мае вялікі процант вільготнасьці, хаваецца тоўстым пластом або ў мяшкох, яно саграваецца, зьлежваецца ў камякі, плясьнівее і ў выніку гэтага траціць сваю ўсхожасьць. Такое насеньне мае вельмі няпрыемны пах.

Калі сваячасова ня прыняць належных мер для зьнішчэньня такога зьявішча, то насеньне становіцца зусім няпрыгодным ня толькі як насенны матар'ял, але ня можа быць скарыстана і для атрыманьня алею.

Пры захаваньні насеньня ў мяшкох вышыня павінна быць роўна 7—8 пластом.

Трэба кожнаму калгасьніку або саўгасьніку памятаць, што насеньне ільну здольна ўбіраць у сябе вільгаць, потым асьлізьняцца. Сьлізь засыхае, доступ паветра да парастка спыняецца і ён задыхаецца. Ад гэтага ўсхожасьць насеньня вельмі зьніжаецца.

Сушка ільну на вешалках (Паўночны Каўказ).

Калі насеньне ільну хаваецца ў каменным памяшканьні, то падлога абавязкова павінна быць драўляная. Ні ў якім разе не павінна быць цэмантная. Каменныя сьцены таксама павінны быць абшыты дошкамі. Калі гэта немагчыма, то мяшкі з насеньнем павінны абавязкова ўкладвацца на драўляныя краткі. Каля сьценак таксама павінны быць пастаўлены такія краты.

Разгледзеўшы правільнае захаваньне насеньня ільну, трэба таксама спыніцца і на шкодніках ільнянога насеньня. Да такіх шкоднікаў адносіцца мучны клешч, які водзіцца ў цёплы час году.

Для барацьбы з мучным кляшчом трэба часта рабіць чыстку складаў, а таксама дэзынфэкцыю як складу, так і тары. Дэзынфэкцыю лепш рабіць, калі пустуюць склады. Пры дэзынфэкцыі сьцены абмазваюцца вапнай. Тара, дзе хаваецца насеньне ільну, акурваецца парай серкавага вугляроду.

Пры ўмовах чыстаты складу, сваячасовай ўборкі сьмецьця і адыходаў рэдка можна бачыць прысутнасьць кляшча ў складах. Ні ў якім разе недапушчальна, каб у складзе быў непарадак, напрыклад, зваленыя мяшкі з насеньнем, дзе ёсьць сьмецьце.

Трэба дабівацца, каб усё было на месцы. Мяшкі з насеньнем павінны быць складзены правільнымі радамі.

Ачышчанае насеньне таксама павінна хавацца асобна ад неачышчанага.

Калгасьніца, саўгасьніца, дабівайся, каб у тваім калгасе і саўгасе, дзе ты працуеш, насеньне захоўвалася правільна. Памятай, што ад гэтага залежыць якасьць ураджаю.

А. М.

Цана асобнага нумару 10 кап.

РАБОТНІЦЫ, ЖОНКІ РАБОЧЫХ, САЎГАСЬНІЦЫ, КАЛГАСЬНІЦЫ, БЯДНЯЧКІ І СЕРАДНЯЧКІ-АДНААСОБНІЦЫ. САМАТУЖНІЦЫ,

1773

НЕ ЗАБУДЗЬЦЕ ПАДПІСАЦЦА НА ЧАСОПІСЬ

„РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА БЕЛАРУСІ“

ВЫДАНЬНЕ ЦК КП(б)Б

на 1933 год

Часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“ выходзіць 3 разы ў месяц

КОШТ ПАДПІСКІ:

1 месяц.	. . .	— 20 к.
3 „	. . .	— 60 к.
6 „	. . .	1 р. 20 к.
1 год.	. . .	2 р. 40 к.

Падпісацца можна: на пошце, у лістаносца, ва ўпаўнаважаных друку на прадпрыемствах, у калгасах, у кіёску „Саюздруку“.

Не прапускайце апошняга тэрміну падпіскі, бо інакш падпіска будзе перанесена на наступны месяц.

Каб ня было перабояў у дастаўцы часопісі, лепш падпісвайцеся на больш доўгі тэрмін—на год ці паўгода.

Абавязкова захоўвайце квіткі аб падпісцы.

Калі вы, падпісаўшыся, не атрымліваеце часопісі, зьвярнецеся ў тую паштовую ўстанову, якая павінна вам яе дастаўляць. Пошта абавязана задаволіць скаргі падпісчыка на працягу 48 гадзін. Калі на мясцовай пошце нельга дабіцца здавальняючага выніку, перашлеце скаргу ў рэдакцыю.

Пастановай прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) і калегіі Наркам РСІ СССР ад 7 мая ўстаноўлена суровая адказнасьць асоб, якія ведаюць экспэдыраваньнем друку, за несваячасовую дастаўку выданьняў падпісчыкам.

Шырока разгортвайце сацспаборніцтва паміж дэлегацкімі сходамі, фабрыкамі, саўгасамі, калгасамі жактамі на лепшае распаўсюджаньне часопісі.

У кожным цэху, калгасе, саўгасе, жакце неабходна выбраць упаўнаважаных па падпісцы на часопісь.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, Савецкая 63, 3-ці паверх, 11 пакой.
Рэдакцыі часопісі „Работн. і калг. Беларусі“

Выданьне ЦК КП(б)Б

Адк. рэдактар Э. ШАПІРА.

Друкарня імя Сталіна — Заказ № 2885 — У ліку 18.850 экз. — Горліт № 1416.